КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 46 (269) ◂ 9 снежня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ПАВЕЛ СЕВЕРЫНЕЦ

Стар. 5

**ХТО ЎЗНЯЎ КОШТЫ НА АЎСЯНКУ**

У адрозненне ад дэфіцыту савецкага ўзору, у якасці галоўнага дэфіцыту сёння выступае «крыша», так званая магчымасць атрымання рэсурсаў на льготных умовах

Стар. 4

**НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЬ ТОЛЬКІ ПАЧАЛА РАСЦІ**

Пра сітуацыю ў лагеры расійскіх лібералаў і сітуацыю ў Расіі пасля думскіх выбараў журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з адным з лідараў партыі «Яблоко» Аляксеем Яблыкавым

Стар. 13

**ДАСЛЕДЧЫЦА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З АЁВЫ**

Стар. 15

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10046

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**ДА НОВАГА ГОДА МОЖНА ПАСПЕЦЬ ПАДПІСАЦЦА НА «НОВЫ ЧАС» ПА СТАРЫХ КОШТАХ!**

▸ МІРНЫ АТАМ

# ПАГРОЗА ЎСЁЙ ЕЎРОПЕ

Вольга ХВОІН

**Літва катэгарычна супраць будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі ў Астраўцы. Па словах прадстаўніка Літоўскага зялёнага руху, Беларусь не завяршыла працу па інфармаванню суседзяў аб будаўніцтве АЭС, што мусіць быць зроблена згодна з Орхускай канвенцыяй. Тым часам дамоўленасці аб выдзяленні Беларусі грошай на будаўніцтва АЭС ужо дасягнутыя.**




На будаўніцтва станцыі Расія выдзяляе Беларусі звязаны дзяржаўны крэдыт на суму да 10 мільярдаў долараў. Згодна з умовамі крэдытавання, Расія аплаціць 90 працэнтаў кошту будучай АЭС, астатнія 10 працэнтаў будуць прафінансаваныя беларускім бокам. Крэдыт будзе выкарыстоўвацца на працягу 10 гадоў — тэрмін будаўніцтва АЭС — пасля чаго будзе пагашацца на працягу 15 гадоў. Першапачаткова кошт будаўніцтва станцыі ацэньваўся ў 3,5 мільярда долараў, потым называлася лічба ў 4 мільярда еўра, і нават да 12 мільярдаў долараў.

Плануецца, што АЭС будзе складацца з двух энергаблокаў агульнай магутнасцю да 2,4 тысяч МВт. Генпадрадчык будаўніцтва АЭС, расійская кампанія «Атамбудэкспарт», заявіла пра гатоўнасць запуску першага энергаблока ў 2017 годзе. Другі блок АЭС плануецца запусціць у 2018 годзе. Эксплуатуючай станцыю арганізацыяй прызначана Дырэкцыя будаўніцтва АЭС.

Працўнікі будаўніцтва ў Беларусі атамнай электрастанцыі тлумачаць, што для пацярпелай ад аварыі на ЧАЭС краіны, атамная станцыя — гэта аграмадная дадатковая рызыка. А рэактар, які мяркуецца ўсталяваць на станцыі, не мае практычнага прымянення і будзе ўпершыню задзейнічаны на беларускай АЭС.

Асабліва негатыўна намер Беларусі пабудаваць атамную станцыю ўспрымае Літва. Астравецкая пляцоўка знаходзіцца ўсяго ў 50 кіламетрах ад Вільні. Ян Хаверкамп, дарадца па пытаннях палітыкі Грынпіс, на міжнароднай канферэнцыі ў Вільні «Ядзерная энергетыка — праблемы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя, эканомікі і заканадаўства» заявіў, што цяпер атамнага рэнесансу ў свеце няма і быць не можа. А той факт, што ў балтыйскім рэгіёне ёсць шэсць праектаў АЭС, уключна з беларускай, паказвае на «адрыў ад глабальнай плыні». Хаверкамп паведаміў, што «Грынпіс звярнуўся ў Еўрапейскія структуры для правядзення стрэс-тэстаў на АЭС, што размешчаныя побач з вялікімі гарадамі. Мусіць быць зроблены аналіз на выпадак аварыйных сітуацый і магчымасцяў эвакуацыі насельніцтва». Прадстаўнік Грынпіса мяркуе, што Беларуская АЭС можа так і не дачакацца фінішу будаўніцтва, бо ў Беларусі могуць узнікнуць праблемы з фінансаваннем гэтага праекту.

Намеснік старшыні Літоўскага зялёнага руху Лінас Вайнюс, каментуючы планы краін балтыйскага рэгіёну пабудаваць атамныя станцыі, гаворыць, што найперш грамадскасці не хапае поўнай інфармацыі аб гэтых праектах, а таксама аб магчымых альтэрнатыўных прапановах. «Цяпер уражанне, што мы вярнуліся ў часы халоднай вайны, калі на атамную энергетыку ўскладаліся вялікія спадзяванні, — гаворыць прадстаўнік «зялёных» Літвы. — Падавалася, што пасля закрыцця Ігналінскай АЭС для рэгіёна будзе больш спакойны перыяд, але намеры будаўніцтва перакрэслілі ранейшыя спадзевы». Літва мае намер пачаць будаўніцтва Вісагінскай АЭС на пляцоўцы Ігналінскай атамнай станцыі, якая цяпер знаходзіцца ў стадыі закрыцця.

«У Літве, па апошніх апытаннях, 90 працэнтаў насельніцтва супраць літоўскага атамнага праекта. У любым выпадку, урад мусіць прыйсці ў Сейм з праектам закона аб канцэсіі гэтай АЭС. І літоўскі праект на гэтым моку і накрыцца. Праекты ж Беларускай і Калінінградскай АЭС звязаныя з палітычнай воляй канкрэтных персонаў, — гаворыць Казімерас Уока, дэпутат літоўскага парламенту. — Я быў на зачыненай Ігналінскай АЭС, глядзеў, колькі там адходаў, колькі будзе каштаваць яе зачыніць, і пераканаўся, што атамная станцыя — самы дурны спосаб атрымаць энергію».

Лінас Вайнюс адзначае агрэсіўную рэакцыю лабістаў атамнай энергетыкі. «Мы ў Літве, нашы калегі з Беларусі і Расіі ведаюць, што любая крытыка АЭС успрымаецца як здрадніцтва. У гэтай атмасферы вельмі складана праводзіць рацыянальную дыскусію. Але мы спадзяемся, пакуль не прадастаўленыя крэдыты, сітуацыю можна перагледзець», — гаворыць Вайнюс.

Беларускія ўлады спрабавалі правесці ў Вільні грамадскія слуханні па Астравецкай атамнай станцыі. Але тады ўзніклі праблемы з якасцю перакладу, і прысутныя людзі выказалі пратэст такім слуханням, калі значная частка інфармацыі для іх папросту незразумелая. «Беларускі бок мяркуе, што ўжо ўсё завершана, але літоўскі бок з гэтым не згодны. Мы, як прадстаўнікі грамадскасці, трымаемся такой жа думкі. У рэальным жыцці мы бачым, што дамовы падпісваюцца, грошы выдзяляюцца, але практыка паказвае — можна грошы патраціць, але нічога не пабудаваць, — адзначае намеснік старшыні Літоўскага зялёнага руху Лінас Вайнюс. — І я б вельмі хацеў, каб беларускае грамадства не пацярпела ад гэтых задум уладаў, вам і так хапае розных цяжкасцяў. Навошта яшчэ ўвязвацца ў такі супярэчлівы праект? Калі вы і мы пойдзем далей са сваімі атамнымі праектамі, то ўсе рэсурсы, усе сілы ўладаў будуць скіраваныя менавіта на гэта. У выніку ні палітычнай увагі, ні фізічных сілаў не хопіць, каб развіваць энергазберажэнне, альтэрнатыўныя крыніцы энергіі».

На згаданай вышэй міжнароднай канферэнцыі быў падрыхтаваны адкрыты ліст да савету міністраў замежных спраў краін АБСЕ. «Мы, прадстаўнікі грамадскасці, навукоўцы, эксперты і палітыкі форму еўрапейскіх краін... заклікаем Савет міністраў АБСЕ звярнуць увагу, што ядзерная энергетыка ставіць пад пагрозу саму бяспеку насельніцтва краін АБСЕ, як у нацыянальным, так і больш шырокім міжнародным кантэксце». У лісце ёсць заклік-просьба дапускаць грамадскасць, незалежных спецыялістаў і навукоўцаў да прыняцця адказных рашэнняў па ядзернай энергетыцы, а таксама патрабаванне да наднацыянальных структур, адказных за бяспеку навакольнага асяроддзя, уключыць пытанне аб ядзерных энергетычных праблемах у працу АБСЕ. «Мы патрабуем сумленную ацэнку сітуацыі ў сусветнай ядзернай энергетыцы, мы заклікаем да мараторыя на новыя ядзерныя праекты», — гаворыцца ў адкрытым лісце.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ПРАКУРОР ЗВОЛЬНІЎ, ШАПІРА НЕ ЗГОДНЫ

**На мінулым тыдні Генпракурор Беларусі Аляксандр Канюк з калегамі ў рамках праверкі дзяржорганаў у рэгіёнах інспектавалі працу службоўцаў у Лідскім раёне.**

Стан кардыялагічнага аддзяленні Лідскай цэнтральнай раённай лякарні абрынуў у шок. Пры наяўнасці вольных месцаў у платных палатах пацыентаў змяшчалі ў калідоры. У саміх палатах з гнілымі вокнамі, працякаючымі столямі ў цвілі і грыбку, замест пяці чалавек знаходзілася па адзінаццаць. Ужо 1 снежня Аляксандр Канюк паведаміў журналістам, што галоўны ўрач бальніцы быў зняты з пасады.

Але Алег Тыс нядоўга заставаўся без працы. Па інфармацыі з кулуараў Гродзенскага аблвыканкама, 5 снежня на працоўнай планёрцы Сямён Шапірааднавіў лекара ў ранейшай пасадзе.

**Паводле «Блог Гродна s13»**

### МУЗЕЙ КДБ НЕ ДЛЯ ЎСІХ

**Актывістаў «Гавары праўду» не пусцілі ў музей КДБ.**

Менавіта так можна інтэрпрэтаваць адказ дзяжурнага Брэсцкага абласнога кіравання КДБ на ініцыятыву актывістаў грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» і іншых дэмакратычных арганізацый, якія паспрабавалі падаць заяўку на калектыўнае наведванне музея дадзенай спецслужбы ў Брэсце.

Не так даўно актывістам стала вядома, што ў будынку Упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Брэсцкай вобласці размяшчаецца музей, у экспазіцыі якога захоўваюцца экспанаты, пачынаючы з 1920 года. Экскурсію планавалася правесці 20 снежня, у дзень прафесійнага свята супрацоўнікаў дзяржаўнай бяспекі.

Аднак 6 снежня дзяжурны па ўпраўленні КДБ на пытанне пра ўмовы падачы заяўкі на калектыўнае наведванне музея прадстаўнікамі дэмакратычнай грамадскасці горада ў досыць карэктнай і добразычлівай форме паведаміў, што пытанне перададзена кіраўніцтву. Таксама высветлілася, што ў будынку гэтай спецслужбы на бягучы момант праводзяцца рамонтныя працы і рэалізаваць калектыўнае наведванне, прынамсі ў гэтым годзе, ніяк не атрымаецца.

**Паводле сайта «Віртуальны Брэст»**

### ЯШЧЭ АДЗІН ПАД ЗНОС

**Чарговай ахвярай зносу вось-вось стане гістарычны будынак па вуліцы Пляханава, 8 у Гомелі.**

Гэта той самы дом, у двары якога стаіць мураваная сцяна з надпісамі, датаваннымі 1941 годам, той самы, дзе, па легендзе, жылі слугі графа Паскевіча, што варагавалі з суседзямі (зрэшты, таму і пабудавалі высокі цагляны мур паміж дварамі). Той драўляны шматкватэрны дом з унікальнымі каванымі ганкамі, якія, не чакаючы зносу будыніны, звінцілі цыгане. А разам з імі сышоў у нябыт прыклад мастацкага аздаблення мяшчанскай архітэктуры XIX стагоддзя.

**Паводле сайта КЛІЧНІК.INFO**

### НОВЫ КІРАЎНІК ЗАБАРАНІЎ ПІКЕТ

**Юры Панфілаў, нядаўна прызначаны на пасаду старшыні Чыгуначнай раённай адміністрацыі Віцебску, забараніў праводзіць пікет да ўгодкаў Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека 10 снежня.**

Заяўку на пікет падавала Алена Фаміна, даверaная асоба Дзмітрыя Уса на мінулых прэзідэнцкіх выбарах. Падчас пікету яна меркавала запісаць ахвотных у ініцыятыўную групу прыхільнікаў прапановы спадара Уса, каб унесці змены ў выбарчае заканадаўства.

Меркавалася, што пікетоўцаў будзе ўсяго двое. Але кіраўнік адміністрацыі адмовіў на той падставе, што ініцыятарка не падала дамовы з міліцыяй — наконт аховы ўдзельнікаў, з хуткай дапамогай — каб каля пікету дзяжурыла машына, і са службай ЖКГ — каб пасля мерапрыемства зрабілі «генеральную прыборку».

**Паводле ПЦ «Вясна»**

### АДЗНАЧЫМ 19 СНЕЖНЯ

**Каардынатар Руху «За Свабоду» Хрыстафор Жаляпаў выступіў арганізатарам масавых мерапрыемстваў, прысвечаных мінулагоднім падзеям 19 снежня.**

Заяўка на правядзенне акцый ужо накіравана ў Віцебскі гарвыканкам. Мэта правядзення вулічнага шэсця і сходу — дэманстрацыя салідарнасці з асуджанымі за ўдзел у мірнай акцыі 19 снежня 2010 года на плошчы Незалежнасці горада Мінска, а таксама патрабаванне іх неадкладнага вызвалення. Мяркуецца, што таксама будзе заяўлены пратэст супраць збздзнення беларускага народа.

Заяву на правядзенне акцый, акрамя Хрыстафора Жаляпава, падпісалі таксама Аляксей Гаўруцікаў і Ян Дзяржаўцаў.

Мерапрыемствы павінны адбыцца ў гадавіну пратэстаў супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня. Шэсце плануецца правесці ў цэнтры Віцебска ад 16.30. Сход — на плошчы Свабоды з 17 да 18 гадзін.

Акрамя ліста ў гарвыканкам накіраваныя прапановы на заключэнне дамоваў на абслугоўванне мерапрыемстваў да медыкаў, камунальнікаў і ў міліцыю.

**Паводле сайта Руху «За Свабоду»**

---

ПАЗІЦЫЯ

## НЕХТА «ЗА», НЕХТА «СУПРАЦЬ»

**Таццяна ШАПУЦЬКА**

**Палітвязні выказалі сваю пазіцыю адносна публічнага звароту да Аляксандра Лукашэнкі з заклікам пакаяцца і вызваліць апанентаў з турмы.**

Нагадаем, удзельнікі штовечаровай мінскай малітвы за палітвязняў ды сваякі несправядліва асуджаных месяц таму скіравалі зварот у Адміністрацыю прэзідэнта з просьбай памілаваць зняволеных. Ідэя адкрытага ліста ўзнікла пасля таго, як сталі вядомыя факты ціску на палітвязняў, якія адмаўляліся падпісваць хадайніцтвы на памілаванне.

Хваля вызваленняў спынілася, калі 14 палітвязняў сказалі цвёрдае «не» на прапанову падпісаць хадайніцтва да Лукашэнкі і выйсці на свабоду. Тады сваякі ды паплечнікі палітвязняў пайшлі на хітры крок і ад свайго імя заклікалі Аляксандра Лукашэнку памілаваць асуджаных. «Мы молімся, каб Госпад крануў вашае сэрца, каб даў вам адкрыцца на Яго любоў, Яго праўду, Яго свабоду. Першы крок пакаяння і любові — гэта вызваленне і рэабілітацыя ўсіх зняволеных», — пішуць аўтары звароту. Адказу з Адміністрацыі прэзідэнта пакуль што не было, а вось першая рэакцыя ад палітвязняў, за якіх уласна і заступаліся падпісанты звароту, ужо маецца.

Першымі лісты з падзякамі і сваімі думкамі даслалі экс-кандыдат на прэзідэнта Мікалай Статкевіч, старшыня «Маладога Фронту» Зміцер Дашкевіч і прадпрымальнік з Ваўкавыска Мікалай Аўтуховіч.

Пратэстант Зміцер Дашкевіч найбольш рэзка ацаніў зварот грамадскасці да Лукашэнкі: «Як я, дык не рызыкнуў бы прасіць Бога за такога таварыша, каб не сцягнуць на галаву сваю гневу».

Мікалай Аўтуховіч верыць у патэнцыйную амністыю палітвязняў, але сумняецца, што вызваленне асуджаных адбудзецца па прычыне міласэрнасці.

Палітвязень Мікалай Статкевіч пазітыўна ацаніў згаданы публічны ліст: «Вы вельмі слушна зрабілі, што звярнуліся і да гэтага чалавека, бо ў кожнага павінен быць шанец, павінен быць выбар». Апошнія 2 месяцы лісты Мікалая Статкевіча практычна не выходзяць з-за межаў калоніі, але гэты адказ бесперашкодна дайшоў да адрасатаў.

---

СУД

## НА ПРЫМУСОВАЕ ЛЯЧЭННЕ

**Таццяна УЛАСЕНКА**

**6 снежня ў судзе Маскоўскага раёна Мінска была разгледжана справа Аляксандра Крутога, бацькі пацярпелай ад выбуху ў метро 11 красавіка Інэсы Крутой.**



Ён быў затрыманы 20 верасня і абвінавачаны ў хуліганстве. У пастанаўленні аб затрыманні Аляксандра Крутога гаварылася: «17 жніўня, знаходзячыся ў кабінеце адной з медычных установ Мінска, наўмысна здзейсніў хуліганскія дзеянні з асобым цынізмам і грэбаваннем нормамі маралі». Гэта выявілася ў тым, што А. Круты нібыта выліў на галоўурача вадкасць з пахам мачы. Аляксандра накіравалі ў РНПЦ псіхічнага здароўя на абследаванне.

Судовае пасяджэнне адбывалася без Аляксандра Крутога. А пацярпелая галоўны ўрач паліклінікі №32 Валянціна Чупрык запатрабавала закрытага суда. Супраць выступіла адвакат абвінавачанага Валянціна Мацкевіч. Аднак суддзя Аляксандр Кострыкаў падтрымаў хадайніцтва пацярпелай. З судовай залі былі выдалены журналісты і назіральнікі.

Дачка абвінавачанага Інэса Крутая была запрошана на суд у якасці сведкі. Яна так пракаментавала гэтую справу:

— Калі б майго бацьку хацелі асудзіць па сённяшняй справе, то зрабілі б гэта адразу. Аднак ніхто яго не шукаў. Мой бацька займаў актыўную пазіцыю ў судзе аб тэракце ў метро: ён абараняў мае інтарэсы як пацярпелай ад выбуху, задаваў нязручныя пытанні суддзям, выступаў аб пераносе працэсу да адмены ў Беларусі смяротнай кары. Я лічу, што сённяшні суд з'яўляецца следствам актыўнай пазіцыі майго бацькі, які намагаўся высветліць, хто ўсё ж арганізаваў тэракт у метро і хто яго здзейсніў. На апошнія судовыя пасяджэнні па справе аб тэракце мой бацька так і не трапіў, мае інтарэсы як пацярпелай прадстаўляць не было каму. Зараз няма каму шукаць сапраўдных віноўнікаў тэракту. А па сённяшняму працэсу ўлады самі дзейнічаюць нелагічна: калі майго бацьку называюць вар'ятам, то чаму яго да суда трымалі разам з іншымі зняволенымі ў агульнай камеры на Валадарцы?

«Гэта звычайнае судзілішча. На суд не прывезлі абвінавачанага. Магчыма, на яго аказваўся фізічны ціск, магчыма, яго моцна збілі. Галоўны ўрач, якая выступіла сёння ў якасці пацярпелай, неаднойчы адмаўляла Інэсе Крутой у абследаванні і лячэнні. У паліклініцы ёй была пастаўлена звычайная бытавая траўма», — сказала праваабаронца Кацярына Садоўская.

Нагадаем, Аляксандр Круты займаўся праваабарончай дзейнасцю. Ён абараняў на судах простых людзей, а таксама цікавіўся самымі гучнымі судовымі працэсамі. У тым ліку, ён прысутнічаў на ўсіх судовых пасяджэннях па справе М. Аўтуховіча. На рахунку Крутога налічваецца некалькі выйграных судовых спраў. Напачатку 2000-х Аляксандра Крутога змяшчалі ў псіхіятрычную ўстанову за абразу Лукашэнкі.

У звязку з уціскам і пераследам з боку ўладаў, Аляксандр Круты папрасіў палітычнага прытулку для сябе і сваёй сям'і ў нямецкім пасольстве.

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ПОЛЬСКУЮ ПРАКУРАТУРУ АБВІНАВАЦІЛІ

**6 снежня на імя Генеральнага пракурора Польшчы Анджэя Шэрэмета паступіў зварот ад імя пяці беларускіх і міжнародных арганізацый.**

У лісце актывісты абвінавачваюць пракуратуры розных гарадоў Польшчы ў негатыўным стаўленні да беларускага незалежніцкага руху і супрацоўніцтве з беларускім рэжымам. У сувязі з гэтым прадстаўнікі арганізацый хочуць сустрэцца з Шэрэметам і паспрабаваць угаварыць яго паўплываць на сваіх падначаленых.

Пад зваротам да генпракурора Польшчы падпісаліся Цэнтр «Супрацоўніцтва без межаў», «Звяз на карысць дэмакратыі ў Беларусі», «Малады Фронт», «Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя» і «Еўрапейская Беларусь».

Як доказы сваіх абвінавачванняў прадстаўнікі арганізацый нагадваюць аб рашэнні пракуратуры Быдгашча пра фактычную забарону бел-чырвона-белага сцяга і шматгадовы пераслед пракуратурай у Беластоку беларускага палітуцекача Андрэя Жукаўца.

Таксама беларусам незразумела, чаму супрацоўнікі генеральнай пракуратуры Польшчы, якія выдалі банкаўскія дадзеныя Алеся Бяляцкага, да гэтага часу не панеслі заслужанага пакарання.

Ліст у канцылярыю генеральнай пракуратуры быў перададзены прадстаўніком Цэнтра «Супрацоўніцтва без межаў» Ігарам Шчакарэвічам і прадстаўніком «Звязу на карысць дэмакратыі ў Беларусі» Анатолем Міхнаўцом.

**Прэс-служба Цэнтра «Супрацоўніцтва без межаў»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХУТКА НОВЫ ГОД

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Яшчэ не наступіла сярэдзіна снежня, але, здаецца, ужо поўным ходам ідзе падрыхтоўка да Новага года. На плошчах паставілі елкі, упрыгожаныя крамы, некаторыя ўжо запальваюць гірлянды, рэстараны прапануюць «навагоднее меню». І шмат хто думае аб наступствах святкавання і планах на 2012 год.**

З 10 снежня ў Мінску стартуе «антыпетардная» спецаперацыя. Барацьбу з нелегальнымі гандлярамі петардамі і іншай піратэхнікай супрацоўнікі мінскай міліцыі будуць праводзіць сумесна з калегамі з гарадскіх падраздзяленняў МНС і падатковай інспекцыі.

Як паведаміла прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама, штодзённа на дзяжурства па барацьбе з нелегальнымі «піраманамі» будуць заступаць мабільныя групы з ліку супрацоўнікаў раённых УУС сталіцы і міліцэйскага спецназа.

Пры выяўленні парушэнняў у гэтай сферы вінаватыя могуць быць прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці па частцы 8 артыкула 12.17 (парушэнне правілаў гандлю і аказання паслуг насельніцтву) і артыкуле 23.48 (парушэнне правіл абыходжання з агнястрэльнай зброяй, выбухованебяспечнымі, палкімі, едкімі рэчывамі або піратэхнічнымі вырабамі) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. У гэтым выпадку ім пагражае штраф. Акрамя гэтага, увесь тавар, канфіскаваны ў падпольнага распаўсюджвальніка піратэхнікі, падлягае наступнаму знішчэнню.

Думаю, міліцыя з канфіскаваных прыладаў будзе здольная зладзіць самы прыгожы салют.

Беларускі парламент можа ў снежні ратыфікаваць крэдытнае пагадненне з Расіяй аб будаўніцтве АЭС. Пра гэта паведаміў 7 снежня журналістам у Мінску старшыня праўлення «Белзнешэканамбанка» Павел Калаур.

> Ермакова паведаміла аб планах акругліць цэны да 50 рублёў. Разліковыя білеты наміналам 10 і 20 рублёў «сябе зжылі», і на іх друкаванне ідуць «вялікія грошы»

«Па маім глыбокім перакананні, ратыфікацыя адбудзецца ў снежні, магчыма, нават да 20 снежня», — сказаў Калаур. Ён паведаміў, што ідзе падрыхтоўка тэхнічнага пагаднення «Белзнешэканамбанка» і расійскага «Знешэканамбанка», якія будуць абслугоўваць крэдыт, непасрэдна па працэдурах уліку і разліку.

«У нас няма праблем з пункту гледжання падрыхтоўкі гэтага пагаднення. Адразу пасля ратыфікацыі, дзесьці ў пачатку наступнага года, мы такое пагадненне падрыхтуем», — сказаў Калаур.

Так што ў Новы год мы будзем, хутчэй за ўсё, з новым крэдытам. Хаця якім чынам мы будзем гэты крэдыт сплачваць — вялікае пытанне.

Новую купюру вартасцю 200 тысяч рублёў плануецца выпусціць у абарачэнне ў першым квартале 2012 года, паведаміла старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзея Ермакова. Дэталі, а таксама тое, як будзе выглядаць новая купюра, Ермакова раскрываць не стала.

Пра тое, што Нацбанк замовіў новую купюру, старшыня праўлення ўпершыню паведаміла 20 кастрычніка. Паводле яе слоў, на купюры будзе адлюстраваны «адзін з твораў беларускай архітэктуры».

Апрача таго, Ермакова паведаміла аб планах акругліць цэны да 50 рублёў. Паводле яе слоў, разліковыя білеты наміналам 10 і 20 рублёў «сябе зжылі» і на іх друкаванне ідуць «вялікія грошы».

Так што ў новым годзе мы будзем не толькі з новым крэдытам, але і з новымі грашыма. І з новымі коштамі. Да гэтага трэба рыхтавацца.

Не адстаюць ад навагодняй ліхаманкі і парламентарыі. Здаецца, яны вырашылі прыйсці ў 2012 без даўгоў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні 7 снежня прынялі ў другім чытанні папраўкі ў некаторыя законы, якія тычацца ўтварэння Следчага камітэта.

Як паведаміў старшыня парламенцкай камісіі па нацыянальнай бяспецы Ігнацій Місурагін, законапраект прадугледжвае карэкціроўку Крымінальна-працэсуальнага кодэкса і іншых законаў у сувязі са стварэннем Следчага камітэта, у прыватнасці з улікам неабходнасці аптымізацыі падследнасці, удакладнення працэсуальнага статусу следчага, начальніка следчага падраздзялення і пракурора ў крымінальным працэсе.

Місурагін таксама падкрэсліў, што ўваходжанне законапраекта ў сілу «дазволіць следчым з 1 студзеня сканцэнтравацца на якасным расследаванні злачынстваў».

Прадстаўляючы 28 лістапада законапраект у першым чытанні, першы намеснік старшыні Следчага камітэта Андрэй Швед паведаміў, што «мадэль Следчага камітэта Беларусі адрозніваецца ад іншых». «Гэта зусім новая мадэль. Размова не ідзе пра нейкае капіраванне, гэта выключана», — сказаў ён.

Пры стварэнні Следчага камітэта, паведаміў Швед, улічваўся шэраг аспектаў. Па-першае, гаворка ідзе пра павышэнне якасці папярэдняга расследавання праз прызму павышэння самастойнасці следчага. Па-другое, гэта павінна быць кампактная магутная структура, як ФБР, якая ў першую чаргу павінна скандэнтравацца на найбольш складаных і значных крымінальных справах.

Нагадаем, указ «Аб утварэнні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь» Аляксандр Лукашэнка падпісаў 12 верасня. Для яго ўтварэння выдзелены следчы апарат з сістэмы органаў пракуратуры, падраздзяленне папярэдняга расследавання з сістэмы органаў унутраных спраў і сістэмы органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Следчы камітэт мае статус «дзяржаўнага праваахоўнага органа і органа папярэдняга следства, падпарадкаванага прэзідэнту Беларусі, які ажыццяўляе ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі паўнамоцтвы ў сферы дасудовай крымінальнай вытворчасці».

Старшынёй камітэта прызначаны Валерый Вакульчык, які раней узначальваў Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце. Яго першым намеснікам прызначаны Андрэй Швед, былы намеснік генеральнага пракурора — начальнік следчага ўпраўлення Генеральнай пракуратуры. Таксама прызначаны яшчэ трое намеснікаў старшыні Следчага камітэта і начальнікі ўпраўленняў камітэта па Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях, а таксама Мінску.

Афіцыйна Следчы камітэт пачне працаваць 1 студзеня 2012 года.

А пакуль ідзе такая актыўная падрыхтоўка, некаторыя вырашылі з'ехаць з краіны хто куды. Прыкладам, 6 снежня стартавала чарговая беларуская палярная экспедыцыя.

Як паведаміў начальнік Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў (РЦПД) Уладзімір Філімонаў, беларускія палярнікі вылецелі з Мінска ў Кейптаун праз Абу-Дабі. Сёлета з улікам эканамічнай сітуацыі ў Антарктыду накіравалі толькі двух беларусаў — кіраўніка экспедыцыі намесніка начальніка РЦПД Аляксея Гайдашова і супрацоўніка Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Віктара Дзёміна. Яны будуць працаваць у складзе 57-й расійскай антарктычнай экспедыцыі.

А дзе вы будзеце сустракаць Новы год?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ЛІДЗІЯ ЗАБЛОЦКАЯ



13-гадовая Лідзія Заблоцкая з Магілёва з кампазіцыяй «Анёлы дабра» заняла трэцяе месца на міжнародным дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне–2011» у Ерэване. Прадстаўніца Беларусі атрымала 99 балаў. Столькі ж на рахунку Кацярыны Рабавай з Расіі («Рамэо і Джульета»), паведамляе БелаПАН.

Перамогу ў конкурсе атрымаў грузінскі ансамбль «Candy Music», на другім месцы спявачка з Галандыі Рэйчэл («Teenager»). Усяго ў «Еўрабачанні–2011» удзельнічалі выканаўцы з 13 краін.

Магілёўчанка Лідзія Заблоцкая, якая стала трэцяй на міжнародным дзіцячым песенным конкурсе «Еўрабачанне–2011», паведаміла журналістам, што ўжо думае пра штурме дарослага «Еўрабачання», перадае БелТА.

«Па гадах я праходжу і на наступны міжнародны дзіцячы песенны конкурс, але лічу, што мы са сваёй камандай ужо скарылі дзіцячае «Еўрабачанне», і нам трэба ісці далей. У наступным годзе мы плануем удзельнічаць у розных музычных праектах, конкурсах і фестывалях, рыхтаваць новыя песні, а цяпер хацелася б трошкі адпачыць, прыйсці ў сябе, і спакойна асэнсаваць тое, што адбываецца, паколькі мы яшчэ да гэтага часу не адышлі ад маштабнага музычнага свята ў Ерэване», — распавяла юная спявачка пасля сваёй перамогі.

### СВЯТЛАНА ЧОРНАЯ



Інвалід другой групы Святлана Чорная абвясціла галадоўку на знак пратэсту супраць вынесенага пакарання Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву, якія абвінавачаныя ў здзяйсненні арганізацыі выбуху ў сталічным метро і пасобніцтве гэтаму акту адпаведна. Святлана Чорная выказала сумнеў, што суд пакараў сапраўды вінаватых людзей, і напісала адкрыты ліст кіраўніку дзяржавы, перадае «Радыё Свабода».

«Наша краіна — цывілізаваная дзяржава. Аднак у ёй хочуць пакараць смерцю двух маладых людзей, віна якіх выклікае вялікі сумнеў немалой часткі насельніцтва маёй краіны, уключна з пацярпелымі ад тэракту... Віна іх таксама выклікае сумнеў міжнароднай грамадскасці. У выпадку, калі мела месца судовая памылка, гэта пляма не будзе змытая з імя прэзідэнта маёй краіны...»

Святлана Чорная распавяла «Радыё Свабода», што яна ўважліва сачыла за працэсам, хадзіла на абвяшчэнне прысуду. Сама вельмі эмацыйна перажывала, калі пачула рашэнне. Вырашыла звярнуцца да апошняй інстанцыі — кіраўніка дзяржавы.

Святлана Чорная распавяла, што з 30 лістапада (дня вынясення прысуду Канавалаву і Кавалёву) не прымае ежы, п'е толькі ваду. Жанчына абвясціла галадоўку, патрабуючы адмены смяротнага пакарання для Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва.

### СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ



Пісьменніца з Беларусі Святлана Алексіевіч у мінулую суботу была ўганараваная літаратурнай прэміяй Цэнтральнай Еўропы «Angelus». Прэміяй адзначаная кніга «У вайны не жаночае аблічча», паведамляе «Gazeta Wyborcza».

Пры атрыманні прэміі ў Польскім тэатры ва Вроцлаве Святлана Алексіевіч сказала, спасылаючыся на Фёдара Дастаеўскага, што нацыі Цэнтральнай Еўропы паходзяць «з аднаго вар'ятства — з вар'ятства сацыялізму». «Дасюль трагедыя і краса ідуць разам. Мы глядзім на трагедыю, і яна падаецца нам прыгожай, і гэта самае страшнае», — сказала Алексіевіч.

Прафесар Анджэй Завада, які ўваходзіць у журы прэміі «Angelus», падкрэсліў, што сёлета выбар пераможцы быў вельмі цяжкі. «Кожная з кніг, якія апынуліся ў фінале, своеасаблівая і непаўторная», — сказаў прафесар.

Сёлета ў спісе былі адразу дзве кнігі беларускіх аўтарак — «Рыбін горад» Наталкі Бабінай і «У вайне не жаночае аблічча» Святланы Алексіевіч.

Літаратурная прэмія Цэнтральнай Еўропы «Angelus» прызнаецца за найлепшую кнігу з тых, што выйшлі па-польску ў папярэдні год. Выдаўцы могуць вылучаць на яе жывых аўтараў з 21 краіны Цэнтральнай Еўропы. Прэмія складаецца са статуэткі «Angelus» і чэка на 150 тысяч злотых.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ХТО ЎЗНЯЎ КОШТЫ НА АЎСЯНКУ

Сяргей НІКАЛЮК

**У адрозненне ад усеагульнага дэфіцыту савецкага ўзору, у якасці галоўнага дэфіцыту сёння выступае «крыша», так званая магчымасць атрымання рэсурсаў на льготных умовах.**

Заўсёды непрыемна расставацца з надзеяй, спароджанай палітычнымі ілюзіямі. У ліпені ў мяне адбылася спрэчка з суседкай па лесвічнай пляцоўцы, на той момант актыўнай прыхільніцай «адзінага палітыка» (АП). У адрозненне ад мяне, суседка глядзіць тэлевізар. У ліпені галоўны персанаж навінавых тэлеграграм паабяцаў, што праз тры месяца яна забудзе, што «дзесьці цэны падняліся». Ён паабяцаў. Яна паверыла. А я апынуўся крайнім. І тузануў жа мяне чорт за язык. У ліпені кошты выраслі на 3,5%, у кастрычніку (праз тры месяца) — на 8,2%.

Мая суседка — пенсіянерка. Увесь мінулы год родная дзяржава, не шкадуючы часу і грошай, рыхтавала яе да ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах. Звернемся да графіка, узятага на сайце Белстату. Калі рэальны памер прызначаных пенсій у студзені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010-га паменшыўся на 1,4%, то годам раней на тым жа часавым адрэзку ён вырас на 8,1%. Увесь мінулы год лінія, пазначаная трохкутнікамі, знаходзілася вышэй сваіх «калегаў», але ў студзені 2011 года яна спікіравала, у той час як лінія зарплаты, наадварот, свечкай узнялася ўгару. Выбары скончыліся…

## Імпатэнцыя антыманапольнага органа

Ісціна пазнаецца ў параўнанні. За ўвесь мінулы год «набегла» 10,6 інфляцыйных працэнта, а тут за адзін месяц — 8,1. Сітуацыя відавочна выходзіць з-пад кантролю. Спасылкі на знешнія сілы, якія імкнуцца *«дестабилизировать обстановку в стране, посеять хаос, недоверие людей к власти, чтобы потом возникающими проблемами, как удавкой, задушить нашу страну, нашу независимость, развязать руки для прямого вмешательства во внутренние дела и диктовать волю белорусскому народу»*, ужо не здольныя пераканаць нават пенсіянераў.

Пенсіянеры не толькі глядзяць тэлевізар, але і чытаюць «Советскую Белоруссию». Як тут ні працаваць: *«Понятно, что производители поднимают цены не просто так: растут затраты. После девальвации все импортное сырье, ингредиенты подорожали. Но, заходя в магазин, задаюсь простыми вопросами. Вот, например, прилавок с кашами. Всегда с удовольствием беру овсяные хлопья «Экстра» гомельского Новобелицкого комбината хлебопродуктов. Доступно, вкусно, полезно. Только в прошлом году пачка хлопьев стоила 900 рублей. А недавно брал их уже по 4 230. То есть цена выросла в 4,7 раза! Даже доллар по отношению к рублю рос не так быстро»*.

Выснова, да якой прыходзіць журналіст, цалкам укладваецца ў стандартнае ўяўленне пра паводзіны на рынку вытворцы-манапаліста. Артыкул, дарэчы, названы *«Пора брать слово антимонопольному комитету»*. Публікацыі папярэднічала сустрэча АП са старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандрам Якабсонам, на якой абмяркоўвалася «неабходнасць узмацнення антыманапольнага заканадаўства і актывізацыі працы антыманапольнага органа».

Адкрыем Вялікую савецкую энцыклапедыю. Яна ведае слова «манаполія» і тлумачыць яго як буйное гаспадарчае аб'яднанне, з дапамогай якога капіталісты ўсталёўваюць манапольныя цэны з мэтай атрымання манапольнага прыбытку. Ёсць у энцыклапедыі і артыкул, прысвечаны развіццю манаполій у Расіі, але прыведзеныя ў ім факты, як няцяжка здагадацца, не выходзяць за часавыя рамкі 1917 года. Таму для разумення феномену аўсянкі «Экстра» нам давядзецца звярнуцца да іншай крыніцы.

## Грамадства спецыфічных адносін

Класічнай у гэтым сэнсе з'яўляецца мініяцюра сатырыка Міхаіла Жванецкага, прысвечаная дэфіцыту. Не магу адмовіць сабе ў задавальненні працытаваць адзін з фрагментаў: *«Ты приходишь ко мне, я через завсклада, через директора магазина, через товароведа, через заднее крыльцо достал дефицит! Слушай, ни у кого нет — у меня есть! Ты попробовал — речи лишился! Вкус специфический! Ты меня уважаешь. Я тебя уважаю. Мы с тобой уважаемые люди. В театре просмотр, премьера идет. Кто в первом ряду сидит? Уважаемые люди сидят: завсклад сидит, директор магазина сидит, сзади товаровед сидит. Все городское начальство завсклада любит, завсклада ценит. За что? Завсклад на дефиците сидит! Дефицит — великий двигатель общественных специфических отношений»*.




Прынята лічыць, што дэфіцыт у савецкі час быў спароджаны недахопам вытворчых магутнасцяў, і што па меры іх нарошчвання праблема дэфіцыту знікне сама сабой. Аднак гады ішлі, магутнасці ўводзіліся, а ў шэраг дэфіцытных траплялі ўсе новыя тавары і паслугі. Ні будаўніцтва АўтаВАЗа, які ў разы павялічыў вытворчасць легкавых аўтамабіляў, ні будаўніцтва іншых прамысловых гігантаў праблемы дэфіцыту так і не змаглі вырашыць.

Гэты парадокс быў звязаны з тым, што вытворчасць дэфіцыту і выступала ў якасці асноўнай мэты, якую пераследавалі суб'екты савецкай эканомікі. Мэта суб'ектаў рынкавай эканомікі — прыбытак, гэта значыць грошы. Папулярнасць грошай тлумачыцца тым, што яны валодаюць унікальнай здольнасцю абменьвацца на іншыя тавары, але толькі пры ўмове, што іншыя тавары маюцца ў свабодным продажы, іншымі словамі, не з'яўляюцца дэфіцытам.

Звярніце ўвагу, у Жванецкага нічога не гаворыцца пра грошы. Для траплянне ў шэраг паважаных людзей патрэбныя былі не грошы, а права распараджацца дэфіцытам. Такім правам у савецкі час валодалі не толькі працаўнікі гандлю, але і вытворцы-манапалісты тавараў і паслуг. Таму барацьба за захаванне манапольных правоў, якія даюць магчымасць адны віды дэфіцыту абменьваць на іншыя, і складала сутнасць *«общественных специфических отношений»*, што сфарміраваліся ва ўмовах усеагульнай манаполіі на дэфіцыт.

Такі тып манаполіі не мае нічога агульнага з капіталістычнай манаполіяй. У яе аснове ляжыць сінкрэтычнае адзінства ўлады і ўласнасці. Для захавання гэтага архаічнага па сваёй прыродзе адзінства неабходна ідэалагічнае прыкрыццё, якое ў Беларусі выступае ў форме дзяржаўнай ідэалогіі.

Манаполія на дэфіцыт узнікае як рэнта на ўласнасць, якой кіруе першая асоба. Свае рухі цела, накіраваныя на захаванне аднаасобнага права распараджацца дэфіцытам, сама першая асоба лічыць палітычнай дзейнасцю, якая мае сэнс толькі ва ўмовах захавання абсалютнай на яе манаполіі. Таму невыпадкова самога сябе першая асоба называе «адзіным палітыкам», і гэта якраз той выпадак, калі з ім варта пагадзіцца.

## Грошы дэфіцыту не перашкода

Манаполія на дэфіцыт не можа быць адваяваная аднойчы і назаўсёды. Занадта шмат ахвотнікаў «адшчапіць» сваю частку ад маналіту. У СССР гэтым пытанне займаліся нават гандляркі ў крамах, што і пацвярджаў знакаміты афарызм «вас шмат — я адна». Але чым вышэй чалавек уздымаўся па прыступках іерархічнай лесвіцы, тым большымі патэнцыйнымі магчымасцямі «адшчэпліваць» ён валодаў. У выніку трываласць усёй сацыяльнай канструкцыі вызначалася здольнасцю цэнтра стрымліваць націск перыферыі. Два разы ў мінулым стагоддзі даць рады гэтай задачы цэнтр не здолеў, што прыводзіла да распаду адзінай манапольнай прасторы дэфіцыту на лакальныя.

Здавалася б, з актыўным пранікненнем рынкавых адносін у планавую эканоміку савецкага ўзору манаполія на дэфіцыт засталося ў мінулым. У Мінску, як і ў Парыжы, набыць любы тавар і паслугу сёння не праблема. Былі б грошы. Гэта сапраўды так, вось толькі доступ да грошай неяк незаўважна апынуўся манапалізаваны. У якасці галоўнага дэфіцыту сёння выступае «крыша» — магчымасць атрымання рэсурсаў, дэфіцытных падатковых, мытных і іншых ільготаў, танных крэдытаў у банку ды ўсяго астатняга. Таму за любым беларускім манапалістам-вытворцам без цяжкасці можна разгледзець «адзінага палітыка» краіны, які пераправаў палітыку ў сваю манаполію.

У краіне з адкрытай эканомікай захаваць яе не так проста. Справа тут не ў слабасці апазіцыі і не ў пасіўнасці грамадства. Асноўная пагроза манаполіі на палітычны дэфіцыт зыходзіць з боку рынка, і не важна, прыходзіць ён з Захаду ці з Усходу. Рынак развіваецца толькі ў асяроддзі універсальных правіл, манапалізму ж універсальнае асяроддзе процілаказанае. У якасці прыкладу спашлюся на спробы беларускага ўрада пралангаваць да 2017 года норму абавязковага 30-працэнтнага продажу валютнага прыбытку суб'ектамі гаспадарання. З гэтага ж пункту гледжання варта ацэньваць і імкненне дамагчыся адтэрміноўкі на права беларускіх прадпрыемстваў адкрываць рахункі ў банках Расіі і Казахстана.

Вернемся да графіку. Ён дапамагае нам зразумець, што да прэзідэнцкіх выбараў асноўнымі бенефіцыярамі дзяржаўнай палітыкі былі пенсіянеры (прадстаўнікі «большасці»), а пасля выбараў у фаворы апынуліся эканамічна актыўныя грамадзяне (прадстаўнікі «меншасці»). Важная дэталь — па тэмпах падзення рэальнай зарплаты ў лідарах апынуліся працаўнікі бюджэтнай сферы. Маўр, як кажуць, зрабіў сваю справу, маўр можа сысці.

Але сказаўшы «А», уладальнік манаполіі на палітычны дэфіцыт будуць вымушаны з часам прамовіць і наступныя літары алфавіту. На адной літары канкурэнтаздольнай эканомікі не пабудаваць. Іншая справа, што аднаўленая плынь расійскіх шчадротаў здольная істотна замарудзіць працэс засвоення палітыка-эканамічнай азбукі.




Дынаміка асноўных паказчыкаў даходаў насельніцтва (у супастаўных коштах; у % да адпаведнага перыяду папярэдняга года)

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# Павел Севярынец: БЕЛАРУСКІ НАРОД ПАКУЛЬ МАЎЧЫЦЬ

Сяргей ПУЛЬША

**Калі мы ехалі да Паўла Севярынца, напярэдадні ён казаў: «Нічога не прывозьце, у мяне ўсё ёсць. Хіба што пітной вады, бо тут вада не вельмі добрая. Прыязджайце лепш да 13 гадзін, бо ў нядзелю я наведваю царкву. А калі прыехаць да царквы, то мне няма куды будзе падзець ровар».**

Вёска Куплін — недалёка ад Пружанаў. На пад'ездзе да спецкамендатуры нас сустракаюць даволі дагледжаныя дамы. І што здзіўляе — гэта хатняя птушка. Пад колы машын не кідаюцца курыцы, а па дарозе — спрэс індыкі.

Дзверы адкрывае сам Павал і ідзе са мной рэгістравацца. Перапісваючы дадзеныя пашпарту, міліцыянт жартуе: «Ізноў пра Паўла пісаць будзеце? Напішаце, што мы яго крыўдзім?» «Павал, цябе тут не крыўдзяць?» — запытваюся. «Не» — кажа Павал. «Гэта ён зараз так гаворыць, а як выйдзе на тэрыторыю, дык пачне распавядаць вам такое...» — з усмешкай кажа міліцыянт. І мы ідзем у альтанку каля камендатуры.

Мы п'ем гарбату. Павал вельмі цікава распавядае пра жыццё ў Кpropліне, пра сваю працу, але папярэджвае: большая частка з ягоных расповедаў — «не для прэсы». Хутчэй за ўсё, Павал хоча сам пра гэта напісаць. Але на пытанні ўсё ж адказвае.

## Я не адарваны ад рэчаіснасці

— Я працую на чатырох працах. На тры СМІ (калонка ў «Нашай Ніве», рэпартажыкі на «Радыё Рацыя» і хадэцкая газета «Крыніца»), і на фермерскую гаспадарку «Бардо». Няма нават часу на развагі, ці адарваны я, ці не. Да мяне прыязджае шмат людзей. І ў мяне іншым часам складваецца ўражанне, што некаторыя людзі ў Мінску больш адарваныя ад рэчаіснасці, чым я. Дзякуй Богу, што так атрымалася, я знаходжуся недзе пасярэдзіне паміж тымі вязнямі, якіх вызвалілі ўмоўна, і тымі, хто сядзіць зараз у вязніцы. З аднаго боку, становішча няпэўнае, з іншага — людзі прыязджаюць, можна размаўляць, ёсць тэлефон, можна чытаць інтэрнэт. Так што я ў большай гушчыні падзеяў, чым некаторыя на волі.

Спадзяюся, што будзе новая кніжка, пакуль буду знаходзіцца тут. Спадзяюся, што ўдасца дапамагчы палітвязням — актыўна з імі ліступося, прыходзяць адказы. Калі б сам сядзеў у «зоне», вельмі б цяжка было дапамагаць, а так спрабуем дамагчыся, каб святары трапілі да палітвязняў-вернікаў, каб маліліся за палітвязняў. Дарэчы, зараз моляцца за іх не толькі ў Беларусі, але і ў Празе, Варшаве, Вільні, Кіеве. Гэта значыць, што беларусы гуртуюцца дзеля адраджэння. Гэта адказ на тую сітуацыю, у якой мы апынуліся.

## У справе Бяляцкага ў рэжыму «сарвала дах»

— Усе гэта ўкладаецца ў адну карціну. Расія дала грошы, зараз у Беларусі можна рабіць усё, што заўгодна. Таму рэжым робіць тое, што ўмее, — застрашвае, запалохвае людзей, праводзіць рэпрэсіі.

Але ўнутры краіны такое «закручванне гаек» заўсёды заканчваецца тым, што зрывае дах. Рана ці позна яго сарве. А вось «рана ці позна» — гэта пытанне да беларускага народа.

Расія толькі радуецца, калі бачыць прысуды Бяляцкаму і суд над Стэфановічам. Еўропа расцэньвае гэта як выклік. Але некалькі месяцаў сітуацыя будзе замарожаная. Супаў кліматычны сезон і палітычны. Напэўна, зіма ў нас будзе сапраўды зіма. І толькі хіба ўвесну ў нас будзе палітычная вясна.

Еўрапейцам трэба сфармуляваць цвёрдую пазіцыю па Беларусі, скаардынаваную са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Не думаю, што трэба ўвязвацца ў гандаль і прапаноўваць больш грошай, чым прапануе Расія Лукашэнку. Думаю, што гаворка павінна ісці пра тыя каштоўнасці, на якіх найперш грунтуецца Еўропа — маральныя каштоўнасці.

## Інтэграцыя з Расіяй — і смех, і грэх

— Мытны саюз, адзіная эканамічная прастора, Еўразійскі саюз — гэта працяг савецкай традыцыі здаваць аб'ект да 7 лістапада альбо да 1 мая. Не забудземся, што праз некалькі дзён мы будзем святкаваць — мы-та будзем святкаваць, а яны адзначаць — 20 гадоў з таго моманту, як Савецкі Саюз распусцілі за непатрэбнасцю.

Трэба на ўсё гэта адказваць. Пуцін прыходзіць з вялікім інтэграцыйным планам. Гэта вялікі і галоўны ягоны палітычны трамплін на наступныя два тэрміны. І яму трэба неяк аб'ехаць гэтую калдобіну — 20 гадоў распаду Савецкага Саюза. Ён прыдумляе Мытны саюз, у хуткім часе — Еўразійскі саюз (а чым заканчваюцца ў нас хуткабуды, мы ўсе ведаем), каб прыгожа называлася, і ўсё гэта хутка будуецца.

І смех, і грэх. З аднаго боку, гэта несур'ёзна, таму што аўрал, з другога — страшнавата, таму што такія гаргары рана ці позна падаюць, абвальваюцца, а церпяць людзі. Як у выпадку з Мытным саюзам, які пазбавіў беларусаў нармальнага аўтамабільнага рынку. І той жа Еўразійскі саюз зацягвае нас у зону эканамічнай і тэхналагічнай адсталасці і адсякае нас ад еўрапейскай мадэрнізацыі.

Наколькі доўга гэта працягнецца — казаць цяжка. Калі Лукашэнка пад ціскам унутрыбеларускай сітуацыі і ціску Расіі будзе вымушаны пачаць нейкія манеўры на еўрапейскай прасторы, то не доўга. А можа стацца і так, што даволі доўга.

Расія, Еўропа, Лукашэнка… Мы ходзім вакол, таму што, па вялікім рахунку, цэнтр цяжару прыняцця рашэнняў ляжыць у беларускім народзе. Усё, што вакол, — Лукашэнка, Расія, еўрапейцы — гэта вакол. А беларускі народ пакуль маўчыць. Гэта маўчанне вельмі шматзначнае, але нам трэба, каб беларускі народ сваё слова сказаў. Таму мы і з'езд праводзім, і стратэгію прапаноўваем, бо гэта трэба беларускаму народу. Павінна з'явіцца народная сіла, народная партыя, якая будзе выяўляць інтарэсы і пакліканне беларускага народу. Праз 20 гадоў руйнавання Савецкага Саюза, у той час, калі Лукашэнка гатовы ўпасці, Расія скупляе маёмасць, еўрапейцы не ведаюць, што рабіць. Ведаць, што рабіць з Беларуссю, павінны самі беларусы.

## Танны газ — не выхад з крызісу

— У манеўрах з Расіяй Беларусь дамаглася зніжак на кошт газа. І гэта сур'ёзна кансервуе беларускую эканоміку як датацыйную, як савецкую. Савецкая эканоміка таксама трымалася на танных газе і нафце. Замест мадэрнізацыі выкарыстоўвалі танныя прыродныя рэсурсы. Гэта прывяло да таго, што мы зараз апынуліся ў «трэцім свеце».

Нічога добрага тут няма. Лепш зацягнуць паясы на некалькі гадоў, правесці мадэрнізацыю, даць свабоду бізнэсу, разабрацца з татальнай карупцыяй, якая ёсць. Гэта вызваліць вялізныя грошы. І з гэтымі магчымасцямі, з гэтымі сродкамі прыступаць да будаўніцтва новай Беларусі. Нам патрэбна новая тэхналогія, новы адказ на выклікі, якія зараз ёсць. Сусветная гандлёвая арганізацыя — мы ўжо практычна туды ўпаўзлі, сусветны эканамічны крызіс, зона еўра пабач, — як нам да гэтага ставіцца? Інфляцыя, якая з'ядае гэты наш «зайчык»? Трэба ўводзіць талер.

## З'езд БХД

— Я буду прысутнічаць там у «папяровым выглядзе». У асноўным мой тэкст ужо напісаны, асноўныя тэзы ўжо зачытаныя, мае прапановы будуць тычыцца як стратэгіі развіцця партыі, так і развіцця Беларусі. Асноўная тэза — ніяк інакш, што толькі мы самі, ніяк інакш, толькі на хрысціянскіх каштоўнасцях, маральных каштоўнасцях мы можам выстаяць, абараніць незалежнасць, перамагчы рэжым і збудаваць новую Беларусь. Падрабязнасці — 17 снежня аб 11 гадзіне ў Палацы культуры трактарнага завода ў Мінску (смяецца).

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ГАЛАСУЕМ НАГАМІ

**Дзяржава, складаючы розныя балансы ды правальваючы свае пампезныя планы, заўсёды цікавіцца здабыткамі насельніцтва. Маўляў, што там у вас, хлопцы, у кашальках.**



Пасля ўсіх дэвальвацый доларавы склад сярэдняга заробку зменшыўся ўдвая, да 250 долараў. Гэта значыць, шараговага беларуса змусілі штомесяц фактычна фінансаваць бюджэты розных узроўняў на 250 долараў. За тры месяцы атрымліваецца 750 долараў. У эканоміцы сёння, па афіцыйных дадзеных, занята боль за 4 мільёны чалавек. Кожнага з іх дзяржава змусіла палову заробка ахвяраваць на патрэбу эканомікі, якая (так нам кажуць) дынамічна развіваецца.

Вось такая элегантная экспрапрыяцыя прыватнай уласнасці насельніцтва.

Нешта падобнае рабілася ў СССР 1990-х гадоў. Але тая краіна сышла ў нябыт з усімі сваімі былымі кіраўнікамі. А вось гэтае кіраўніцтва Беларусі, падобна да таго, нікуды сыходзіць не збіраецца. Нічога на іх не дзейнічае — ні нізкія рэйтынгі, ні маўклівыя пратэсты, ні кпіны пыхлівых расійскіх калег, ні заходнія санкцыі. Лічаць, што калі абдурылі ўсіх, то абдураць і Бога. А той ім забяспечыць жыццё вечнае?

Аднак мноства беларусаў зусім інакш ацэньваюць свае перспектывы. І калі ўжо нічога нельга змяніць у краіне, якая не можа і не хоча правесці сумленныя выбары, людзі пачынаць галасаваць нагамі. Каго з'ехаць за мяжу на працу змушаюць абставіны, каго — высокія прафесійныя якасці і ўласцівая моладзі няўрымслівасць.

Дакладных лічбаў ніхто не ведае, бо не ўсе настолькі давяраюць уладам, каб паведамляць аб сваіх намерах адпаведным структурам. Але той жа Міхаіл Мясніковіч, якога можна лічыць галоўным прарабам сучаснай эканамічнай палітыкі, на пасяджэнні ўрада адзначыў, што пачаўся адток кваліфікаваных кадраў з краіны. Маўляў, гэты працэс закрануў будоўлю, машынабудаўніцтва і шэраг іншых галін. Трэба сказаць, што Мясніковіч у гэтым пытанні зусім не арыгінальны. Яшчэ яго папярэднік Сяргей Сідорскі турбаваўся на гэты конт і прапаноўваў падняць заробкі будаўнікоў да расійскага ўзроўню. А атрымалася так, як атрымалася. Мала таго, што заробкі ўпалі ніжэй плінтуса, дык яшчэ і будаўніцтва многіх аб'ектаў спынена з нагоды недастатковага фінансавання.

Як паведамляюць СМІ, улады на месцах спрабуюць нешта зрабіць, каб затрымаць моладзь на працоўных месцах, і нават адміністрацыйнымі мерамі. Але ж пры ўсіх відавочных ненармальнасцях нашай «дэбюракратызаванай» дзяржавы, прыгоннага права ў ёй няма. У якасці навіны можна адзначыць, што з краіны пачалі з'язджаць настаўнікі. Ужо нават і ў Расіі гэтай катэгорыі спецыялістаў плацяць болей, чым у Беларусі.



Усё да аднаго, і ўсё не зусім так, як хацелася. А як і чаго хацелася? Прыкладам, свабоднага перамяшчэння капіталаў у адзінай эканамічнай прасторы. Як такую паперу мог падпісаць кіраўнік краіны, дзе капіталістам быць не дазволена, і таму капіталаў няма? Грошы ў многіх ёсць, а капіталаў няма. Звычайная з'ява для грамадства, у якім значная частка эканомікі існуе паралельна афіцыйнай і па-за межамі закона. А з другога боку, канчаткова прадалі «трубу», грошы быццам з'явіліся, але ці не ўсе іх трэба аддаць за пазыкі мінулых часоў. А з актываў, калі ўжо называць газаправод «іржавай трубой», засталіся дзве «керасінкі» — Мазырскі і Наваполацкі НПЗ. Таксама ж працуюць на прывазной сыравіне, а самі па сабе нічога не ўяўляюць.

Акрамя таго ў праекце аб адзінай эканамічнай прасторы ёсць пункт і пра свабоднае перамяшчэнне працоўнай сілы. Зноў атрымліваецца свабода, але з рухам у адзін канец. І таму ўраду спатрэбяцца зрабіць вялізныя намаганні, каб выканаць заклік Мясніковіча для стварэння стымулаў, каб «стрымліваць адток кваліфікаваных кадраў з краіны».

У нас жа атрымліваецца, што кваліфікаваныя кадры нам патрэбны, але кваліфікавана наладзіць працу ніхто не ўмее. Адсюль мізэрныя заробкі і жаданне з'ехаць куды заўгодна, абы плацілі трохі болей.

Ёсць у эканоміцы закон, у адпаведнасці з якім багацце краіны залежыць ад умення найлепш выкарыстоўваць рэсурсы, якія маюцца ў дастатковай колькасці. Ці трэба казаць, што галоўным і амаль адзіным рэсурсам Беларусі з'яўляюцца менавіта людзі, працоўная сіла, найболей кваліфікаваная сярод усіх краін СНД. А шмат хто зольны да канкурэнцыі на значна больш патрабавальных рынках працы.

Вельмі непрыемная гэта рэч — галасаванне нагамі. Калі ад'язджаюць часова, зарабляюць грошы для ўтрымання сямей ды прывозяць у Беларусь, то аб'ектыўна ў нейкай ступені падтрымліваюць айчынную эканоміку. А калі застаюцца за мяжой назаўсёды, калі становяцца там багатымі, але прынцыпова не хочуць укласці ў родную краіну ні капейчыны? Гэта ўжо неаднаўляльныя страты, якія цяжка будзе нечым кампенсаваць нават у далёкай будучыні.

▸ БІЗНЭС

# ІТ-СФЕРА БЕЛАРУСІ: ІНКУБАТАР ДЛЯ МОНСТРАЎ

**Напрыканцы мінулага года работнікам Беларусі абяцалі сярэдні заробак у эквіваленце 500 долараў ЗША. Сёлета гэтая планка істотна знізілася. І ўсё ж нават у крызісны перыяд залі гандлёвых цэнтраў, рэстаранаў, клубаў не апусцелі. Значыць, ёсць яшчэ адпаведныя заробкі і запасы ў беларусаў. Пра адну з самых высокааплатных сфераў — IT-паслугі — журналіст «НЧ» Вольга Хвоін паразмаўляла з упраўленцам кампаніі, што займаецца распрацоўкай праграмнага забеспячэння для замежных заказчыкаў. Мікалай (прозвішча папрасіў не называць) распавёў пра прыбыткі, расходы і верхнюю планку прафесійнага поспеху беларускіх праграмістаў.**



**Для даведкі:**

Аўтсорсінг (ад англ. Outsourcing: (outer-source-using) выкарыстанне знешняй крыніцы / рэсурсу) — перадача арганізацыяй на падставе дагавора пэўных бізнэс-працэсаў або вытворчых функцый на абслугоўванне іншай кампаніі, якая спецыялізуецца ў адпаведнай галіне. У адрозненне ад паслуг сэрвісу і падтрымкі, што маюць разавы, эпізадычны, выпадковы характар і абмежаваныя пачаткам і канцом, на аўтсорсінг перадаюцца звычайна функцыі па прафесійнай падтрымцы бесперабойнай працаздольнасці асобных сістэм і інфраструктуры на аснове доўгага кантракту.

Парк высокіх тэхналогій — гэта спрыяльнае асяроддзе для развіцця бізнэсу ў галіне інфармацыйных тэхналогій у Рэспубліцы Беларусь. Па законе рэзідэнты ПВТ вызваляюцца ад усіх карпаратыўных падаткаў, уключаючы падатак на даданую вартасць, падатак на прыбытак, а таксама мытных пошлін. Індывідуальны падаходны падатак для супрацоўнікаў кампаній-рэзідэнтаў ПВТ мае фіксаваную стаўку і складае 9%.

ПВТ Беларусі — віртуальны парк. Прававы рэжым ПВТ дзейнічае на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Вы можаце зарэгістравацца ў якасці рэзідэнта і выкарыстаць усе перавагі ПВТ незалежна ад таго, дзе размяшчаецца офіс вашай беларускай кампаніі: ад абласнога цэнтра да невялікага населенага пункта. 80% створанага ў ПВТ праграмнага забеспячэння ідзе на экспарт. 45% пастаўляецца ў ЗША і Канаду, 30% у краіны Еўропы, 20% у Расію і СНД.

***— Пачнём з простага і самага распаўсюджанага цяпер пытання: дзе беларусу зарабіць дэкляраваныя 500 долараў?***

— Ды паўсюль! У маім разуменні зарабіць абяцаныя пяцьсот долараў абсалютна не праблема. Канешне, крызіс закрануў усіх. У маіх знаёмых заробкі паменшыліся, але гэтую суму яны зарабляюць. Напрыклад, ІТР — праекціроўшчыкі. Цяпер іх заробкі скаціліся да 100 долараў. Але яны маюць магчымасць падзарабляць, браць «халтуру». Кошт праектных работ у нас касмічны, ад таго ж і будаўніцтва такое дарагое. Таму яны мелі і маюць магчымасць зарабіць у дадатак да афіцыйнага прыбытку.

***— Таму масавых сацыяльных выступаў і няма, бо да нізкай афіцыйнай зарплаты людзі маюць падпрацоўкі?***

— У мяне на гэта свой погляд. У чалавека ёсць нейкі заробак і выдаткі на жыллё, прадукты і г. д. Пасля абвалу заробкаў, калі ёсць нейкія запасы, можна проста дакладаць штомесяц невялікую суму да заробку і колькі месяцаў нармальна жыць. А цяпер вернемся да пытання, хто можа зарабляць згаданыя пяцьсот долараў. Прапановы на рынку ёсць. Але важна не заміраць на адным месцы, увесь час глядзець наперад, імкнуцца да развіцця. Праўда, менталітэт у нас дурны. Усе думаюць, што ім плацяць за тое, што яны ходзяць на працу. Але кожны чалавек — гэта маленькая кампанія, мы прадаём сябе адзін аднаму. Сваім супрацоўнікам я тлумачу: «Вы прадалі сябе нашай кампаніі на месяц, і вы атрымліваеце столькі, колькі мы гатовыя за вас заплаціць».

***— Наколькі ў нас развіты рынак IT? Ці празрыстая праца на гэтым полі?***

— Я мяркую, тыя кампаніі, што не ўваходзяць у Парк высокіх тэхналогій (ПВТ), не зусім адкрыта ў той ці іншай ступені вядуць свой бізнэс. Каб уступіць у ПВТ, трэба выканаць цэлы шэраг умоў, напрыклад, паказаць заробак супрацоўніка ў справаздачны перыяд у памеры не менш за дзве тысячы долараў. Толькі пасля гэтага можна атрымаць падатковыя прэферэнцыі. Кампаніі-монстры, якія там працуюць, як правіла, маюць падтрымку дзяржавы.

Возьмем групу студэнтаў, якія хацелі б туды патрапіць. Але цягам бліжэйшых двух-трох гадоў яны наўрад змогуць туды ўпісацца. Па-першае, ім трэба атрымаць першы праект для працы. Але свае праекты навічкам звычайна ніхто не фінансуе — мусіць быць ці супер-круты спецыяліст ці надзвычай інавацыйны праект. Таму на пачатку многія працуюць па аўтсорсінгу. Пляцоўкі, каб атрымаць першую такую працу, ёсць у інтэрнэце — руская freelancer.ru, амерыканская elance.com і іншыя. Каб напрацаваць кліента, трэба два-тры гады рабіць нізкааплатную працу, супернічаць з Кітаем і Індыяй, якія забіраюць блізу 80 працэнтаў усёй нізкааплатнай працы ў IT. Праца ў гэтай сферы звычайна ацэньваецца ў гадзінах.

Нізкааплатная праца для кампаній — гэта прыкладна 15 долараў у гадзіну, для чалавека планка пачынаецца з пяці долараў за гадзіну. Возьмем для гэтай групы студэнтаў нейкі ўмоўны праект на дзве тысячы долараў. Калі яны хочуць працаваць афіцыйна, то каля тысячы долараў у месяц затрацяцца на офісныя расходы. Застаецца тысяча. Пакуль гэтыя грошы ўваходзяць, 30% трэба абавязкова прадаць дзяржаве, то бок канвертаваць у беларускія рублі. З гэтых грошай, апроч заробку, трэба выплаціць падаткі. Па розных схемах, калі працаваць больш-менш «па-беламу», губляецца каля 46 працэнтаў ад уваходных грошай, а калі зусім празрыста і без падатковых прэферэнцый, то даходзіць да 86 працэнтаў.

Для нас праца на ўнутраны рынак не цікавая з некалькіх прычынаў: тут вялікая канкурэнцыя, мала сапраўды цікавых прапаноў. У нас, да прыкладу, кіраўніцтва заводаў дагэтуль не разумее, што, каб стварыць сайт-візітку, не варта карыстацца паслугаю студэнта за сто долараў. Але пакуль гэта будзе так рабіцца, то і байнэт будзе такім страшным, як цяпер. Дарэчы, на гэтыя сайты часта выдзяляецца не так мала грошай. Я асабіста бачыў тэндэрныя дакументы на пятнаццаць-дваццаць тысяч долараў, а ў выніку сайт меў тры-чатыры старонкі. Бо па дарозе да таго студэнта-выканаўцы гэтыя грошы могуць «губляцца».

Калі кіраўнік IT-фірмы пачынае тут працаваць прыгожа ў адкрытую, то будзе ў два разы больш губляць на накладных расходах. У Беларусі танная працоўная сіла, але вельмі дарагая інфраструктура.

***— Атрымліваецца, што IT-сфера Беларусі — гэта часта студэнцкая праца адпаведнай кваліфікацыі?***

— Студэнты робяць танней, гэта зразумела. Студэнты і «збіваюць» гэты рынак.

Адкрыю невялікі сакрэт: пры падборы IT-кадраў лепш за ўсё браць не мінчаніна, студэнта. Нам цікавы чалавек з прыгараду ці яшчэ адкуль далей. У гэтых людзей вельмі моцная матывацыя. Ён прыйшоў, замацаваўся, зубамі ўхапіўся за сваю працу. Чым добры гэты кандыдат? У яго мала знаёмых на пачатку, вялікія расходы, бо трэба здымаць жытло, уладкоўвацца. Адпаведна, ён многа часу аддае на ўласнае развіццё, працу. Яго каэфіцыент карыснага дзеяння ў разы вышэй, чым у мінчан. Бо ў мясцовых тут дзяўчыны, кампаніі... Чалавек проста прамотвае свой эфектыўны ўзрост. Мазгі працуюць актыўна недзе да 27 гадоў — да гэтага часу ў чалавека можна нешта ўкласці, нейкую базу. Пасля ўжо можна займацца рознай лухтой, а мазгі будуць працаваць на цябе. І часта бывае так, што той, хто да названага ўзросту займаўся фігнёй, застаецца на нізкіх пасадах, дабіваецца меншага.

Яшчэ адзін паказальны момант: ліцэнзійнае праграмнае забеспячэнне. Я не бачыў у Мінску ніводнай кампаніі, дзе б увесь софт рабіўся на ліцэнзійным праграмным забеспячэнні.

***— Ці ахвотна людзі ідуць працаўладкоўвацца ў апісаныя напаўшэрыя фірмы?***

— Часта з супрацоўнікамі афармляюцца кантракты, то бок гэта афіцыйная праца. Пакрываюцца ўсе іх расходы, падаткі. А вось ці сплочваць падаткі дзяржаве — добрая воля кожнага. Калі ж гаварыць пра нейкія сацыяльныя аспекты, то пры заробку ў тысячу ўмоўных адзінак можна дазволіць сабе абслугоўвацца ў медцэнтры, а не стаяць у чэргах у паліклініках. Жыллё? Дастаткова ўладкавацца на некалькі месяцаў на дзяржпрадпрыемства, узяць крэдыт, а потым можна вярнуцца ў ранейшую сферу.

***— Ці закрануў эканамічны крызіс работнікаў IT-сферы?***

— Толькі тыя кампаніі, што арыентаваліся на ўнутраны рынак. Кошт у беларускі рублях застаўся амаль як і раней, і, натуральна, выканаўцы працы страцілі частку сваіх даходаў.

***— Цяпер шырока вядомыя IT-шнікі з Індыі, а якое месца займаюць у рэйтынгу кваліфікаваных спецыялістаў беларускія праграмісты?***

— Да пэўнага моманту я меркаваў, што нашы праграмісты вельмі дасведчаныя. Але пасля супрацы з маскоўскімі, піцерскімі калегамі мая ацэнка ўпала. Не надаюць увагі фундаментальным ведам, адразу кідаюцца «зашыбаць» грошы. У IT ёсць градацыя: юніёр, распрацоўшчык, сеньёр-распрацоўшчык, team-лідар, project-менеджар і г. д. Атрымліваецца, што самая высокая планка нашых праграмістаў на сусветным рынку — распрацоўшчык ці сеньёр. «Зорак», што з'яўляюцца, вельмі хутка змятаюць, бо рынак унутраны невялікі. Напрыклад, звычайны распрацоўшчык у google — гэта ўзровень беларускага «прафесара».

У нас краіна тэарэтыкаў, а не практыкаў. У людзей вялікія чаканні, але іх магчымасці, як правіла, не адпавядаюць гэтаму. Хлопцы вельмі рана абіраюць вузкую спецыялізацыяю і не становяцца спецыялістамі ў шырокім сэнсе. Хаця праграміст — гэта чалавек, які ўмее праграмаваць і абіраць метады, сродкі для рэалізацыі пастаўленая задачы. Але беларуская праграмісты наперад ставяць сродак. Мы з задавальненнем бяром да сябе зноў студэнтаў. У іх мусіць быць матэматычны склад мыслення, добра развітая логіка. Чалавек з падобнымі задаткамі праз паўгода можа прэтэндаваць на заробак у тысячу долараў. Але ёсць праграмісты, якія будуць доўгі час таптацца на адным узроўні. Хутка ўзлятаюць тыя, хто працуе і імкнецца сябе развіваць.

Увогуле, бліжэйшая будучыня беларускага IT-рынку такая: мы робім усю брудную і нізкааплатную работу, адначасова з'яўляемся інкубатарам па вырошчванню мазгоў для Захаду. Добры спецыяліст, працуючы тут па найму, можа зарабляць тры–чатыры тысячы долараў, а ў Піцеры — шэсць–дзесяць. Для беларусаў выгодна туды пераязджаць — недалёка, добрыя прапановы па сацыяльнай інфраструктуры. Над нашымі работнікамі трэба стаяць і прымушаць іх працаваць, а там збіраюцца матываваныя людзі, якім трэба толькі плюшкі падкідваць. Але ў любым выпадку праграмісты — гэта ў пэўнай ступені прывілеяваны клас з добрымі даходамі, высокімі інтэлектуальнымі здольнасцямі, магчымасцямі для развіцця. Напрыклад, многія кампаніі, каб затрымаць спецыялістаў, старанна развіваюць карпаратыўны дух, прапануюць такія бонусы, як курсы англійскай мовы, спартыўныя залі ды іншае.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 12 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### Беларусь 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05** Вострасюжэтны серыял «Замах» (Беларусь-Расія). Заключная серыя.
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Музычная меладрама «Вулічныя танцы» (Вялікабрытанія).
**13.55** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Да цешчы на бліны.
**16.30** Тэлефільм АТН «Чавускія незабудкі» цыклу «Зямля беларуская».
**16.40** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна). 1-я серыя.
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.45, 01.35** «Зона Х».
**19.30** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.40, 01.45** Дзень спорту.
**21.55** Камандзіроўка.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.10** Клуб рэдактараў.
**00.15** «Эпоха».
**00.40** Дак.-гістарычны серыял «У адным кроку ад Трэцяй сусветнай». 1-я серыя.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05, 13.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў».
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Вялікая розніца».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Прэм'ера. «Лёс на выбар».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Тата». Расія, 2004 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Вынікі галасавання за прыз сімпатый Нацыянальнай музычнай прэміі.
**23.05** «Сталічны футбол».
**23.35** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Ясі і худзей.
**09.40** Навіны надвор'я.
**10.10** Жансавет.
**10.50** Кінаспробы.
**11.25** Бітва экстрасэнсаў.
**12.30** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**13.35** Серыял «Гарачы лёд».
**14.35** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Нянудны глобус.
**15.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**16.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**16.50** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**19.50** Авертайм.
**20.25** Халі-Галі. Скетч-шоў.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Чэлсі - Манчэстэр Сіці.
**01.40** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на дзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя@пошта».
**13.00** «Мой срэбны шар».
**13.50, 16.50, 19.50, 00.30** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**23.25** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Руская сенсацыі».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцэйны».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя». Ток-шоў Таццяны.

### Eurosport

**10.30, 00.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**11.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**12.45** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**13.45** Хакей на траве. Турнір «Прыз чэмпіёнаў». Новая Зеландыя. Фінал.
**14.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**16.15** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Польшча. Дзень 4-ы.
**17.45** «Алімпійскія гульні. У Лондан разам. Часопіс.
**18.00** Фігурнае катанне. Фінал Гран-пры. Агляд.
**19.30, 02.30** Футбол. Часопіс.
**20.30, 01.30, 01.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**21.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.45** Вось дык так!!!
**23.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**23.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.

### Белсат tv

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона «Свабоды».
**08.10, 14.00** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 5 серыя.
**08.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.10** Дакументальная гадзіна: «Катынь. Генацыд і прапаганда», дак. фільм: ч. 2.
**09.50, 15.00** ПраСвет.
**10.15, 15.35** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча: 5 серыя.
**11.05, 16.25** Эксперт.
**11.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.50** «Дэраў», біяграфічная драма, ЗША.
**13.30** Зона «Свабоды».
**14.45** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** «Таямніца Сагалі», серыял: 9 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Дакументальная гадзіна: «Катынь. Генацыд і прапаганда», дак. фільм: ч. 2.
**18.45** «Рок назаўжды–2», дак. фільм.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** Вагон.
**20.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пра праўду», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя.
**22.00** Фільматэка майстроў: «Дэраў», біяграфічная драма, 1991 г., ЗША.
**23.40** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар.

## 13 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

### Беларусь 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202».
**10.10** Серыял «Шырокая рака». 1-я серыя.
**11.05** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Арэна.
**12.35** «Еўрафэст». Відэадзённік.
**12.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Камандзіроўка.
**15.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.40** Серыял «Шырокая рака». 2-я серыя.
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.45, 00.55** Зона Х.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202».
**21.00** Панарама.
**21.40, 01.05** Дзень спорту.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.10** «Эпоха».
**00.00** Дакументальна-гістарычны серыял «У адным кроку ад Трэцяй сусветнай» (Расія). 2-я серыя.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** Тэорыя неверагоднасці.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Уладзімір Высоцкі. «Так пакіньце непатрэбныя спрэчкі…».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Тата». Расія, 2004 г.
**10.40** «Справа асобай важнасці».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Манашкі ва ўцёках». Вялікабрытанія, 1990 г.
**15.35** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Машына для забойстваў». Канада, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**00.15** «Дурні, дарогі, грошы».

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**09.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**10.50** Авертайм.
**11.35** Школа рамонту.
**12.40** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**13.45** Серыял «Гарачы лёд».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Нянудны глобус.
**15.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**16.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**16.50** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Камедыйная меладрама «Да чорта каханне!» (ЗША-Германія).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.50** Спорт-кадр.
**00.20** Рэальны свет.
**00.50** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.50** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**23.30** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».
**00.35** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцэйны».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера. Серыял «Фармат А4».

### Eurosport

**10.30** Футбол. Часопіс.
**11.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Польшча. Дзень 4-ы.
**13.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**14.15** Футбол. Часопіс.
**15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт канькавым ходам. Давос (Швейцарыя).
**15.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**17.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**18.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**19.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**20.30** Тэніс. Часопіс.
**21.00** Футбол. Часопіс.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA.
**00.00** Бокс. Турнір Bigger's Better. Лісабон (Партугалія).
**01.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Агляд сезону. Часопіс.
**02.15** Картынг (Францыя). Дзень 2-і.
**03.15** Вось дык так!!!

### Белсат tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША: 1 серыя.
**09.10** «Таямніца Сагалі», серыял: 9 серыя.
**09.35** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**10.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пра праўду», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**10.55** МакраФон: «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі «Луцк-2007»): выступ гурта «Індыга».
**11.25** «Рок назаўжды–2», дак. фільм, Беларусь.
**11.55** «Ранча», серыял: 12 серыя.
**12.45** «Таямніца Сагалі», серыял: 9 серыя.
**13.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пра праўду», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**14.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.15** «Рок назаўжды–2», дак. фільм, Беларусь.
**14.50** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША: 1 серыя.
**16.25** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 12 серыя.
**17.25** Эксперт.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 20 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал.
**21.40** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**22.25** Рэпартэр.
**22.50** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 14 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна).
**10.10** Серыял «Шырокая рака». 2-я серыя.
**11.05** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Сфера інтэрасаў.
**12.35** «Мастак, які малюе на пяску». Дакументальны фільм.
**13.05** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**14.00** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.50** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.40** Серыял «Шырокая рака». 3-я серыя.
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**18.45, 00.55** Зона Х.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**21.00** Панарама.
**21.40, 01.05** Дзень спорту.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.10** «Эпоха».
**00.00** Дак.-гістарычны серыял «У адным кроку ад Трэцяй сусветнай». 3-я серыя.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Асяроддзе пасялення.
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Машына для забойстваў». Канада, 2010 г.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Закахайся ў мяне, калі адважышся». Францыя-Бельгія, 2003 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.50** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**00.45** «Дурні, дарогі, грошы».

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Спорт-кадр.
**09.35** Рэальны свет.
**10.15** Камедыйная меладрама «Да чорта каханне!» (ЗША-Германія).
**12.10** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**13.15** Серыял «Гарачы лёд».
**14.20** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Нянудны глобус.
**15.30** Жаночая ліга.
**16.50** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Камедыя «Я застаюся!» (Францыя).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Спортлато 5 з 36.
**21.30** КЕНО.
**21.35** Беларуская часіна.
**22.40** Халі-Галі. Скетч-шоў.
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Прамая трансляцыя.
**01.00** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.50** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Фільм «Стомленыя ад сонца-2».
**22.40** Прэм'ера. «СССР. Крушэнне».
**00.45** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера. Серыял «Фармат А4».

### Eurosport

**10.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**10.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Агляд сезону. Часопіс.
**11.45** Футбол. Часопіс.
**12.45** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Польшча. Дзень 4-ы.
**14.15, 19.00, 01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**15.45** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**16.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**17.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.45** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**20.00** Тэніс. Часопіс.
**20.30** Абранае па серадах.
**20.35** Конны спорт. Турнір Global Champions Tour. Агляд сезону.
**21.35** Конны спорт. Кубак свету FEI Конкур. Жэнева (Швейцарыя).
**22.35** Навіны коннага спорту.
**22.40** Гольф. Чэмпіянат свету. Дубай (ААЭ).
**23.40** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.45** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**23.50** Абранае па серадах.
**00.00** Live. Конны спорт. Канкур. Лондан (Вялікабрытанія).
**02.45** Весь дык так!!!
**03.00** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.

### Белсат

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 20 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**08.55, 13.45** «Тры шалёныя нулі», серыял: 12 серыя.
**09.25, 14.10** На колах.
**09.50, 14.40** Рэпартэр.
**10.20, 15.05** Асабісты капітал.
**10.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**10.45** Эксперт.
**11.15** Беларусы ў Польшчы.
**11.30** «Ранча», серыял: 13 серыя.
**12.25** «Арол», серыял: 19 серыя.
**13.20** Два на два (тэледыскусія).
**15.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**15.35** Эксперт.
**16.05** Беларусы ў Польшчы.
**16.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.25** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**18.50** «Свае і чужынцы», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.30** Навігатар.
**20.45** «Апантаныя», дак. цыкл: 2 серыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю права.
**21.45** «Каралева Бона», тэлесерыял.
**22.45** Два на два (тэледыскусія).
**23.10** Аб'ектыў.
**23.35** Гарачы каментар.

## 15 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Баявік «Сітуацыя 202» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**10.10** Серыял «Шырокая рака». 3-я серыя.
**11.05** Дэтэктыўны серыял «Атрад».
**12.10** Зямельнае пытанне.
**12.35** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма аб турызме.
**13.05** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Здароўе». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Адмысловы рэпартаж АТН.
**15.40** Зона камфорту.
**16.05** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.45** Серыял «Шырокая рака». 4-я серыя.
**17.50** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**18.45, 00.55** Зона Х.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах». 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.40, 01.05** Дзень спорту.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.10** «Эпоха».
**00.00** Дакументальна-гістарычны серыял «У адным кроку ад Трэцяй сусветнай» (Расія). 4-я серыя, заключная.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Закахайся ў мяне, калі адважышся». Францыя-Бельгія, 2003 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Мечнік». Расія, 2006 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**00.50** «Дурні, дарогі, грошы».

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Страсці па культуры.
**09.45** Гаспадар.
**10.30** Камедыя «Я застаюся!» (Францыя).
**12.25** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**13.30** Серыял «Гарачы лёд».
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Нянудны глобус.
**15.20** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Спартовая меладрама «Аўтсайдары» (ЗША).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.40** Час футболу.
**23.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.
**01.10** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.50** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Прэм'ера. Фільм «Загадка для Веры». 2011 г.
**00.15** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.30** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.

### Eurosport

**10.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**11.00** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**11.15** Конны спорт. Агляд тыдня. Часопіс.
**11.45** Конны спорт. Агляд тыдня. Часопіс.
**12.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**13.05** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**13.15, 17.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**14.15** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск. Трэніроўка.
**15.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**16.30** Live. Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Ансі (Францыя).
**19.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт канькобежным ходам. Давос (Швейцарыя).
**19.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**20.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Ансі (Францыя).
**21.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Латвія.
**01.00** Покер. Лондан (Вялікабрытанія).
**02.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Ансі (Францыя).
**03.15** Весь дык так!!!

### Белсат

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35, 12.20** «Каралева Бона», тэлесерыял: 6 серыя.
**08.35, 13.20** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**09.15, 14.05** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 12 серыя.
**09.45** Праект «Будучыня».
**10.10** Навігатар.
**10.30** «Свае і чужынцы», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**10.50** Два на два (тэледыскусія).
**11.15** Маю права.
**11.35** «Апантаныя», дак. цыкл: 2 серыя.
**11.50** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**14.30** Праект «Будучыня».
**15.00** Навігатар.
**15.15** «Свае і чужынцы», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**15.35** Два на два (тэледыскусія).
**16.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.10** «Апантаныя», дак. цыкл: 2 серыя.
**16.25** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г.,Беларусь: ч. 2.
**17.00** «Зорны пірат», тэлесерыял: 3 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Басаножа па свеце.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Лінія Сталіна. Гонар ці ганьба?», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**18.40** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 5 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx».
**20.25** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Доўгае падарожжа цераз гісторыю Балканаў», дак. фільм, 2010 г., Сербія.
**22.50** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 11 серыя.
**23.35** Аб'ектыў.
**00.00** Гарачы каментар.

9

## 16 снежня, пятніца

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна). 1-я серыя.
**10.05** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна). 4-я серыя.
**11.05** Дэтэктыўны серыял «Атрад» (Расія-Украіна). Заключная серыя.
**12.10** Сфера інтэрасаў.
**12.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**13.05** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**14.05** «Галерэя». Дакументальны фільм («Беларусьфільм»).
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Фартыфікацыя.
**16.15** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.55** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна). 5-я серыя.
**18.00** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.40, 02.10** Дзень спорту.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Прэм'ера. Фантастычны баявік «Кніга Ілая» (ЗША).
**00.35** Моладзевая камедыя «Ніхто не ведае пра сэкс-2» (Расія).

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «МУР. «Артысты».
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі.
**23.25** «Наша Белараша».
**00.00** Фільм «Праклятая».
**01.50** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Мечнік». Расія, 2006 г.
**10.40** «Ашуканцы».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Паўфінал Першай лігі Міжнароднага Звяза КВЗ.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Еўрапейскія покерныя турніры».
**00.20** Фільм «Бандыты ў масках». Францыя.
**02.20** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Прэм'ера. Дакументальна-пазнавальны серыял «Сусвет са Стывенам Хокінгам» (ЗША). 1-ы выпуск.
**10.00** Час футболу.
**10.45** Ясі і худзей.
**11.20** Школа рамонту.
**12.30** Цела чалавека.
**13.05** Страсці па культуры.
**13.50** Серыял «Гарачы лёд».
**14.50** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Нянудны глобус.
**15.50** Жаночая ліга.
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Сямейная меладрама «Гульня слоў» (ЗША-Германія).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Бітва экстрасэнсаў.
**22.35** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.25** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Паўфінал.
**00.55** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Паўфінал. Прамая трансляцыя.

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.50** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**22.35** Фільм «Пачуй маё сэрца». 2010 г.
**00.25** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ліцейны».
**21.25** Прэм'ера. «Гісторыя ўсерасійскага змяну».
**23.10** Фантастычны баявік «Шосты дзень».

### Eurosport

**10.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Агляд.
**11.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Ансі (Францыя).
**12.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142.
**13.50** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**14.00** Live. Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне.
**15.00** Live. Футбол. Ліга Еўропы. Лёсаванне.
**15.30** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**15.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету. HS 109.
**16.30** Live. Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Ансі (Францыя).
**17.45** Live. Лыжнае дваяборства. Кубак свету.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Кваліфікацыя.
**19.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Супер-гігант.
**20.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Навіны.
**20.30** Гонкі на колавых трактарах. Чэмпіянат Еўропы.
**21.00** Цімберспорт. Чэмпіянат свету. Каманды. Нідэрланды.
**21.30** Цімберспорт. Чэмпіянат свету. Каманды. Нідэрланды.
**22.00** Бокс. Турнір Bigger's Better. Лісабон (Партугалія).
**23.00** Live. Бокс. Турнір Bigger's Better. Лісабон (Партугалія). Фінал.
**01.15** Покер. Каны (Францыя).
**03.15** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.

### Белсат tv Belsat

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** Басанож па свеце.
**08.00** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 5 серыя.
**08.45** Рэпартэр.
**09.10** «Зорны пірат», тэлесерыял: 3 серыя.
**09.40** «Euromaxx».
**10.05** «Лінія Сталіна. Гонар ці ганьба?», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**10.40** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Доўгае падарожжа праз гісторыю Балканаў», дак. фільм, 2010 г., Сербія.
**11.40** Эксперт.
**12.10** Басанож па свеце.
**12.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял.
**13.20** «Euromaxx».
**13.50** «Зорны пірат», тэлесерыял: 3 серыя.
**14.15** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 5 серыя.
**15.00** Рэпартэр.
**15.25** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Доўгае падарожжа праз гісторыю Балканаў», дак. фільм, 2010 г., Сербія.
**16.25** «Лінія Сталіна. Гонар ці ганьба?», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**17.00** «Букаландыя», мультсерыял для дзяцей: 2 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**18.50** «Апантаныя», дак. цыкл, 2011 г., Беларусь: 2 серыя.
**19.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.05** Маю права.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.20** Невядомая Беларусь: «Уладзімір Караткевіч. Душа застанецца», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет.
**21.50** «Смерць як луста хлеба», маст. фільм, 1994 г., Польшча.
**23.45** Вагон.
**23.55** Аб'ектыў.
**00.20** Гарачы каментар.

## 17 снежня, субота

### 1 Беларусь

**06.35** Існасць.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Ранішняя хваля.
**09.45** Скрынка перадач.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** Прэм'ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Народная камедыя «Белыя Росы».
**14.00** Мультфільм.
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Дэтэктыўная камедыя «Навагодняя засада» (Расія).
**17.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Горад мары, што ажыццявілася».
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** Музычны фэст «Крым Мюзік Фэст».
**21.00** Панарама.
**21.45** Трылер «Пракляты шлях» (ЗША).
**23.55** Меладрама «Палюбоўнікі» (ЗША).
**01.45** Дзень спорту.

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**12.00** Камедыя «Несусветная мітусня».
**13.40** «Піліп Кіркораў. «Іншы».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Уладзімір Высоцкі. «Так пакіньце непатрэбныя спрэчкі…».
**17.20** «Адмысловае заданне».
**18.40** «Адзін супраць усіх».
**19.25** Прэм'ера ОНТ: «Фактар смеху».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Балеро».
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** «Што? Дзе? Калі?».
**00.40** Фільм «Цыкуты, або Сусветная гісторыя атручванняў».

---

**07.05** «Анфас».
**07.20** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.05** «Я - вандроўца».
**09.30** «Чыстая праца».
**10.20** «Мінск і мінчане».
**10.55** Фільм «Замарожаны». Францыя-Італія, 1969 г.
**12.20** «Прыгоды дылетанта».
**12.50** Фільм «Аб бедным гусары замоўце слова». СССР, 1980 г.
**15.45** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Цудоўная даліна». Расія, 2004 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Сакрэты Лос-Анджэлеса». ЗША, 1997 г.
**22.50** «Зорны рынг».
**00.05** «Покер дуэль».
**00.55** Фільм «Бабнік». ЗША, 2009 г.
**02.30** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Заключная серыя.

### 2 Беларусь

**07.20** Сямейная меладрама «Гульня слоў» (ЗША-Германія).
**09.05** Дабравест.
**09.30** Мір вашай хаце.
**09.40** Пра мастацтва.
**10.10** Жансавет.
**10.55** Тэлебарометр.
**11.00** Ясі і худзей.
**11.35** Школа рамонту.
**12.45** Інтуіцыя.
**13.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**14.40** Гістарычная драма «Анастасія Слуцкая» («Беларусьфільм»).
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.15** «Здзейснім мару разам». Дабрачынны канцэрт.
**18.10** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».
**19.55** Бітва экстрасэнсаў.
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Бітва экстрасэнсаў.
**22.20** Камедыйная меладрама «Жыццё, або Нешта ў гэтым родзе» (ЗША).
**00.10** Інтуіцыя.
**01.05** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** Фільм «Пачуй маё сэрца». 2010 г.
**08.35** «Крывое люстэрка».
**10.25** «Ранішняя@пошта».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Ты памятаеш».
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.45** Прэм'ера. «Ні кроку назад. Бітва пад Масквой».
**15.45** Фільм «Прэферанс па пятніцах».
**17.35** Прэм'ера. «Новая хваля - 2011». Лепшае.
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Дом без выйсця».
**00.05** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.10** Серыял «Марскія д'яблы».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Акадэмія прыгажосці».
**08.55** «Гатуем».
**09.30** «Выратавальнікі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**00.00** Фільм «Адстаўнік-2».

### Eurosport

**10.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Ансі (Францыя).
**11.45, 02.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Жанчыны. Спроба 2.
**12.15** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Спроба 1.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Кваліфікацыя.
**14.00** Live. Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Ансі (Францыя).
**14.45** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 10 км класічным стылем.
**16.00** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137.
**17.30** Live. Лыжнае дваяборства. Кубак свету.
**18.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Ансі (Францыя).
**19.15** Live. Снукер. Турнір Players Tour Championship (PTC).
**00.00** Live. Конны спорт. Канкур. Лондан (Вялікабрытанія).
**01.30** Live. Санкавы спорт. Кубак свету. Мужчыны. Спроба 1.
**03.00** Live. Санкавы спорт. Кубак свету. Мужчыны. Спроба 2.

### Белсат tv Belsat

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял.
**08.20** «Букаландыя», мультсерыял.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.10** Невядомая Беларусь: «Уладзімір Караткевіч. Душа застанецца», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.50** Еўропа сёння.
**10.15** ПраСвет.
**10.40, 14.10** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**11.05** «Апантаныя», дак. цыкл: 2 серыя.
**11.15** МакраФон: «Рок-карона–2009»: выбранае, ч. 1.
**11.50** «Букаландыя», мультсерыял.
**12.15** Калыханка для самых маленькіх.
**12.40** Невядомая Беларусь: «Уладзімір Караткевіч. Душа застанецца», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**13.15** Еўропа сёння.
**13.45** ПраСвет.
**14.35** «Смерць як луста хлеба», маст. фільм, 1994 г., Польшча.
**16.35** Вагон.
**16.40** Навігатар.
**17.00** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**17.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Аляксандр Салжаніцын», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах.
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.25** «Дарога Статкевіча», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Ідэальны жыхар», трылер, 1999 г., ЗША.
**23.15** «Мент», дэтэктыўны серыял: 3 серыя.
**00.10** Аб'ектыў.

## 18 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**1 БЕЛАРУСЬ**

**07.15** «Бальная сукенка».
**08.30** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Медычныя таямніцы.
**10.15** Да цешчы на бліны.
**10.50** Прэм'ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Музычная камедыя «Гусарская балада» (СССР).
**14.05** Мультфільм.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Тэлефільм АТН «Гісторыя па крупінках» цыклу «Зямля беларуская».
**15.45** Дак. серыял «У пошуках скарбаў».
**16.35** Камедыя «Прыезджыя» (ЗША).
**18.20** Суперлато.
**19.05** Прыгодніцкі баявік «Смокінг» (ЗША).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** «Еўрафэст». Відэадзённік.
**22.10** Меладрама «Апошні шанец Харві» (ЗША).

**ОНТ**

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** Фазэнда.
**11.45** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.50** «Гумар FM».
**14.15** Прэм'ера. Фільм «Два дні».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.20** «Эстрадны кактэйль».
**18.25** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў». Фінал.
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. Юрыю Нікуліну - 90! Юбілейны вечар.
**23.15** Прэм'ера. «Чырвоная зорка».
**00.25** Камедыя «Старыя разбойнікі».

**СТВ**

**07.15** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.00** «Аўтапанарама».
**09.30** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.20** «Вялікі сняданак».
**11.00** Фільм «Сакрэты Лос-Анджэлеса». ЗША, 1997 г.
**13.30** «Добры дзень, доктар».
**14.05** Фільм «Самотным даецца інтэрнат». СССР, 1983 г.
**15.45** Ток-шоў «Такі лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Мяжа. Тайговы раман». Расія, 2000 г.
**23.15** Прафесійны бокс.
**00.15** Фільм «Вайсковы рэквіем». Вялікабрытанія , 1988 г.

**2 БЕЛАРУСЬ**

**07.45** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава» (СССР).
**09.20** Прыступкі Веры.
**09.35** Таямніцы Душы.
**10.00** Цела чалавека.
**10.45** Тэлебарометр.
**10.50** Ясі і худзей.
**11.25** Школа рамонту.
**12.35** Інтуіцыя.
**13.45** Прыгодніцкая камедыя «Прышэльцы» (Францыя).
**15.50** Кінаспробы.
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**18.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**19.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Сіці - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**21.10** Спортлато 5 з 36.
**21.15** КЕНО.
**21.20** Навіны надвор'я.
**21.55** Фантастычная камедыя «Аслеплены жаданнямі» (ЗША- Германія).
**23.45** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ.
**01.30** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Фінал.

**РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.15** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.40** Фільм «Дом без выйсця».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама».
**12.35** Фільм «Губернатар».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** Прэм'ера. «Абмянялі хулігана на Луіса Карвалана..».
**15.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.15** Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына» (СССР).
**17.55** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера - 2011. «Стылягі-шоў».
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».

**НТВ**

**07.10** Серыял «Марскія д'яблы».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Увага: вышук!».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль-4».
**15.05** «ГРУ. Таямніцы ваеннай выведкі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Таемны шоў-бізнэс».
**23.00** «Нтвшнікі».
**00.00** Фільм «Сховішча».

**EUROSPORT**

**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137.
**11.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. Спроба 1.
**12.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. Спроба 1.
**13.30** Live. Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**15.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137.
**15.45** Live. Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137.
**17.30** Live. Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Ансі (Францыя).
**18.00** Лыжнае дваяборства. Кубак свету.
**18.45** Снукер. Турнір Players Tour Championship (PTC).
**20.00** Бокс. Турнір Bigger's Better. Лісабон (Партугалія). Фінал.
**21.00** Live. Снукер. Турнір Players Tour Championship (PTC).
**00.00** «Алімпійская мара». Алімпійскі часопіс.
**00.15** Live. Конны спорт. Канкур. Лондан (Вялікабрытанія).
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137.
**02.30** Live. Снукер. Турнір Players Tour Championship (PTC).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды».
**07.45** На колах.
**08.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 9 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Прыватная калекцыя.
**10.00** Два на два (тэледыскусія).
**10.25** «Дарога Статкевіча», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**11.00** Асабісты капітал.
**11.15** «Аляксандр Салжаніцын», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**12.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**12.30** Вагон.
**12.40** На колах.
**13.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 9 серыя.
**13.55** Калыханка для самых маленькіх.
**14.25** Прыватная калекцыя.
**14.55** МакраФон: Канцэрт гурта «Ляпіс Трубяцкой».
**15.25** «Ідэальны жыхар», трылер, 1999 г., ЗША.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 6 серыя.
**18.00** Два на два (тэледыскусія).
**18.25** Вагон.
**18.35** «Таямніцы Ватыкану», дакументальны серыял, 2005 г., Польшча: 1 серыя.
**19.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.15** Калыханка для самых маленькіх.
**19.30** Дакументальная гадзіна: «Эпоха Барадуліна», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** «Дайсці да Плошчы», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт.
**22.15** Фільматэка майстроў: «Зажмурся», маст. фільм, 2003 г., Польшча.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.30** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01 Вольга;
Слуцк: (8044) 755 66 48 Марына.

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З новага 2012 года мы вымушаны ўзняць падпісны кошт аднаго нумара газеты да 1200 руб., аднаго месяца — 4800 руб. Для тых, хто паспее падпісацца ў гэтым годзе, кошт застанецца ранейшым (750 руб. за нумар).

Запрашаем да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл.: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ГЕАПАЛІТЫКА

# ЧАРГОВЫ ІМПЕРСКІ СЦЭНАР

Алег НОВІКАЎ

**Каб спыніць працэс палітычнай дэстабілізацыі ў Паўднёвай Асеціі, Масква можа скарыстацца праектам аб'яднання асецінаў.**

Маскоўскі сцэнар выбараў у Паўднёва-Асецінскай Рэспубліцы, якая літаральна ўсім абавязаная Расіі, не прайшоў. Краіна, якая прэтэндавала на ролю сусветнай супердзяржавы, апынулася не ў стане легітымна пасадзіць свайго стаўленіка нават у крэсла прэзідэнта рэспублікі. Не дапамагла стаўленіку Крамля Анатолю Бібілаву нават асабістая падтрымка прэзідэнта РФ Дзмітрыя Мядзведзева. Перамагла апазіцыянерка Ала Джыоева.

У выніку выбары прызналі несапраўднымі. А вярхоўны суд Паўднёвай Асеціі пакінуў у сіле гэта рашэнне. Джыоева заявіла пра намер прасіць палітычнага прытулку.

Цяпер сітуацыя ў краі нестабільная. Адным са сцэнараў выхаду для Крамля можа стаць рэалізацыя плану аб'яднання Паўднёвай і Паўночнай Асеціі ў адну адміністрацыйную адзінку ў складзе Расіі.

Трэба ўзгадаць, што фармальна асецінцы аказаліся падзеленымі ў 1774 годзе. Паўночныя асецінскія тэрыторыі былі ў ліку першых на Паўночным Каўказе далучаныя да Расійскай імперыі. Між тым, паўднёвая частка Асеціі стала расійскай у 1801 годзе, аднак яна ўвайшла ў Імперыю ў складзе Грузіі. Пасля Цхінвалі стаў часткай Тыфліскай губерні.

Ідэя аб'яднання Паўночнай і Паўднёвай Асеціі не новая. Упершыню пра яе пачалі казаць пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У часы існавання незалежнай Грузінскай рэспублікі бальшавікі спрабавалі стварыць у Паўднёвай Асеціі партызанскі рух, які выступаў пад нацыянальнымі лозунгамі. У 1920 годзе тут нават была абвешчана Савецкая ўлада, але меншавіцкі ўрад Грузіі здушыў паўстанне. Пасля ліквідацыі грузінскай незалежнасці са студзеня 1921-га па красавік 1922 года Паўднёва-Асецінская вобласць уваходзіла ў склад паўночна-каўказскай Горскай АССР у складзе РСФСР. Пасля яе вярнулі пад кантроль Тбілісі, надаўшы статус аўтаномнай вобласці.

У 1926 годзе абласны з'езд рад Паўночнай Асеціі прызнаў неабходным зліццё з Паўднёвай Асеціяй і стварэнне аўтаноміі ў складзе Грузінскай ССР.

Сталін даў згоду на праект, аднак пасля перагледзеў план. Фатальную ролю адыграла аналітычная запіска кіраўніцтва Паўночна-Каўказскага краю. Анастас Мікаян — кіраўнік рэгіёну — адправіў Сталіну шыфроўку, дзе выкладаў свой погляд на пытанне: «Уключэнне аб'яднанай Асеціі ў склад Грузіі і пераход у Закаўказзе ставіць пад пагрозу міжнацыянальныя адносіны, якія ўсталяваліся сярод нацыянальнасцяў Паўночнага Каўказа… Гэта можа стаць прэцэдэнтам да ператварэння ў рэспублікі раёнаў Чачні, Кабарды і іншых, што, у сваю чаргу, можа парушыць паміж імі раўнавагу, якая ледзьледзь усталявалася». На той час нацыянальна-адміністратыўная рэформа са стварэннем нацыянальных рэспубліканскіх аўтаномій толькі пачыналася.




Пасля вялікага тэрору 1937 года ў аб'яднальнага руху не стала рухаючай сілы — паўночна-асецінскай інтэлігенцыі, і пра яго ніхто больш не ўспамінаў шмат гадоў. Пра братоў на поўначы паўднёвыя асеціны ўзгадвалі хіба што падчас кампаній грузінізацыі. Так, у 1951 годзе ЦК кампартыі Грузіі даў указанне пра перавод справаводства на тэрыторыі Паўднёвай Асеціі на грузінскую мову. Пачаліся пратэсты і заклікі да аб'яднання з братамі на поўначы. У 1956 годзе Прэзідыум ЦК КПСС прыняў з гэтай нагоды адмысловую пастанову «Пра памылкі і недахопы ў працы ЦК КП Грузіі».

Пра інтэграцыю асецін зноў пачалі казаць пад канец існавання СССР. Яшчэ ў апошнія дні існавання Савецкага Саюза ідэя інтэнсіўна абмяркоўвалася па абодва бакі Каўказскага хрыбта. У Паўднёвай Асеціі гэта ідэя паўстала пад уплывам росту грузінскага нацыяналізму канца 1980-х гадоў. Як вядома, у 1990-м грузінская ўлада ліквідавала права асецін на аўтаномію, што выклікала выбух салідарнасці з імі ў паўночных суайчыннікаў.

У 1992 годзе кіраўніцтва Паўночнай Асеціі адмовілася падпісваць дакумент пра размежаванне паўнамоцтваў паміж Масквой і Уладзікаўказам, калі Расія не прыме ўдзелу ў абароне паўднёвых асецінаў. 6 сакавіка 1993 года Вярхоўны парламент Паўночнай Асеціі прызнаў незалежнасць Рэспублікі Паўднёвая Асеція (на 15 гадоў раней Расіі, якая да вайны ў жніўні 2008-га была не гатовая змяніць статус-кво ў зоне канфлікту).

Прызнанне Масквою ў жніўні 2008 года незалежнасці Паўднёвай Асеціі стварыла проста парадаксальную сітуацыю. Паўднёвая Асеція — гэта рэспубліка, якая мае хай і дэкаратыўныя, аднак некаторыя адзнакі дзяржаўнасці. Але гэта дзяржава нашмат саступае (і па тэрыторыі, і па насельніцтву) Паўночнай Асеціі, якая не з'яўляецца незалежным самастойным дзяржаўным фармаваннем. Да прыкладу, у Паўночнай Асеціі пражывае каля 700 тысяч чалавек, а колькасць жыхароў Паўднёвай Асеціі — прыкладна 50 тысяч чалавек.

Нядзіўна, што кіраўніцтва Паўночнай Асеціі не разумее сітуацыю і перыядычна ўздымае праблему аб'яднання нацыі. Такі тэзіс быў агучаны, напрыклад, 12 мая мінулага года прэзідэнтам Паўночнай Асеціі Таймуразам Мансуравым. На думку кіраўніка рэспублікі, «любому непрадузятаму назіральніку ясна, што цяперашняе «паасобнае» існаванне дзвюх Асецій не можа працягвацца доўга».

Цяперашняя фронда ў Паўднёвай Асеціі супраць маскоўскага стаўленіка Бібілава зноў надае актуальнасць праекту стварэння адзінай Асеціі. Гэта формула дазваляе захаваць Цхінвалі ў зоне ўплыву Масквы. Пры гэтым гаворка можа не ісці пра ліквідацыю Паўднёва-Асецінскай дзяржаўнасці. Галоўнае — проста прывязаць паўднёва-асецінскую палітычную дыскусію да расійскай.

Варта нагадаць пра адзін з аспектаў асецінскай нацыяналістычнай дактрыны. Паўднёва-асецінскі праект першапачаткова фармаваўся не як сепаратысцкі, а як ірэдэнтысцкі (тэрмін «ірэдэнтызм» выкарыстоўваецца для пазначэння палітычнага руху на карысць аб'яднання народаў, нацый і этнасаў у рамках тытульнай дзяржавы. Пры гэтым мэта аб'яднання дзвюх Асецій пад эгідай Расіі разглядалася як прыярытэт. Незалежнасць Паўднёвай Асеціі, у адрозненне ад Абхазіі, бачылася толькі як нейкі часовы этап для рэалізацыі «аб'яднальнай» ідэі.

Безумоўна, у праекта асецінскага адзінства есць вялікія палітычныя рызыкі. Так, тэма асецінскага адзінства можа выклікаць рэанімацыю ідэй аб'яднання іншых каўказскіх этнасаў.

Аднак, думаецца, галоўная рызыка для Масквы цяпер у іншым. 11 снежня пройдуць прэзідэнцкія выбары ў Прыднястроўі, дзе ў Крамля таксама ёсць «свой» кандыдат. Як кажуць аналітыкі, яго агітацыйная кампанія вельмі нагадвае тую, якую праводзіў у Паўднёвай Асеціі Бібілаў. Калі супраць Масквы ўздымецца яшчэ Прыднястроўе, якое Масква фактычна карміла з 1991 года, то канфлікт у Цхінвалі набудзе новыя контуры. Яго можна разглядаць як працяг гістарычна заканамернай тэндэнцыі пратэстаў ускраін супраць дыктату цэнтру. Відавочна, у такім вымярэнні Масква не можа выступаць у ролі патрона асецінскага адзінства.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Элізабэт Тэйлар двойчы выходзіла замуж за брытанскага акцёра Рычарда Бэртана і двойчы з ім разводзілася. Нікому не вядомая амерыканская шлюбная пара з Арызоны зрабіла той жа трук 51 раз. Але ўсім гэтым грамадзянам вельмі далёка да Крамля і Бацькі Лукашэнкі. Колькасць палітычных шлюбаў і разводаў Масквы і Мінску пры кіраванні Аляксандра Рыгоравіча ўжо даўно перастала падпадаць нават самаму прыблізнаму падліку.

**«Газета» (Малдова)**

Дзякуючы больш танным цэнам на газ дэфіцыт рахунку бягучых аперацый Беларусі скароціцца з 7-мі да 4 мільярдаў долараў у год. Гэтых сродкаў рэспубліцы хопіць, каб спакойна пражыць па дакрызіснай мадэлі яшчэ тры гады. Пасля грошы зноў скончацца, і гэта будзе за год да заканчэння прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі. Праўда, гэту дзірку ў 4 мільярда яму цалкам па сілах заткнуць пры дапамозе прыватызацыі іншых прадпрыемстваў. Такім чынам, з Масквы беларускі лідар з'ехаў хай і без трубы, але затое з цвёрдымі гарантыямі свайго знаходжання ва ўладзе да 2016 года. На гэтым эпоха Лукашэнкі, верагодна, і скончыцца, бо прадаваць Беларусі будзе ўжо асабліва няма чаго. Акрамя таго, няма чым будзе выбіваць з Расіі новыя крэдыты і зніжкі.

**«Коммерсантъ» (Расія)**

У Беларусі кожны, хто заступіцца за ахвяру, можа сам стаць ахвярай, пра што сведчаць нядаўнія супярэчлівыя абвінавачванні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў на адрас вядучага праваабаронцы, які, у сваю чаргу, патрабаваў вызвалення апазіцыйных палітыкаў, што дагэтуль знаходзяцца ў турме.

**«Independent» (Вялікабрытанія)**

Заціснутая ў сталыя рэпрэсіі (у тым ліку падатковых) украінская эканоміка не зможа развівацца доўга. Таму вынікам аўтарытарнага сцэнару можа стаць зацяжная стагнацыя або спроба скінуць існуючы рэжым. І тут, дарэчы, трэба паглядзець на сённяшнюю Беларусь. Усе 17 гадоў кіравання Аляксандра Лукашэнкі суправаджаліся палітычнымі рэпрэсіямі, гаворка ішла толькі пра іх паслабленне ці ўзмацненне. Але ўсе гэтыя гады Лукашэнка заставаўся самым папулярным беларускім палітыкам, а значны абвал яго рэйтынгу пачаў назірацца толькі сёлета, калі здарыўся найбольш маштабны ў найноўшай гісторыі Беларусі эканамічны крызіс.

**«Комментарии» (Украіна)**

І калі ў той бясконцай спрэчцы, якую стагоддзямі вядуць гуманісты і прыхільнікі радыкальных мер, патрэбны яшчэ адзін аргумент супраць смяротнага пакарання, то вось ён: працэс у Мінску, дзе былі асуджаны Кавалёў і Канавалаў. Ён прайшоў з фантастычнай хуткасцю, пакінуўшы пасля сябе столькі пытанняў, што міжволі, нават дапускаючы, што асудзілі злачынцаў, пранікаешся жалем да асуджаных і да іх сваякоў.

**«Грані.ру» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. СТАБІЛЬНЫ ЭЛЕКТАРАТ



Пацыенты псіхічных клінік Расіі яшчэ раз пацвердзілі свой статус стабільнага электарату партыі Пуціна-Мядведзева. Прынамсі паўсюль у дамах вар'ятаў цэнтральных рэгіёнаў РФ яны масава галасавалі за «Адзіную Расію». Самы высокі вынік галасавання за партыю «Адзіная Расія» зафіксаваны ў псіхіятрычнай лякарні імя Гіляроўскага ў Маскве. Тут аж 93% пацыентаў аддалі галасы за АР, а 6% прагаласавалі за «Справядлівую Расію» (магчыма, на думку журналістаў, гэта быў медперсанал). Такі высокі паказнік, праўда, не звязаны з папулярнасцю тандэма ў палатах. Проста існуе адпрацаваны механізм галасавання за АР. Яго апісала адна з газет Ульянаўска. Хворы-выбаршчык бярэ бюлетэнь, водзіць па ім вачамі і доўга не можа зразумець, што рабіць: ці распісвацца, ці крыжык ставіць. Але старшыня выбарчай камісіі ахвотна тлумачыць, дзе ставіць крыжык. Адпаведна, усё як адзін усё ставяць пазнакі насупраць «Адзінай Расіі». Як тут ні згадаць папулярны ў час выбарчай кампаніі хіт «Наш дурдом голосует за Путина».

**Паводле расійскай прэсы**

### ЛІВІЯ РЫХТУЕ ІНТЭРВЕНЦЫЮ Ў СІРЫЮ?

Брытанская газета «Telegraph» выступіла з сенсацыйнай навіной. Калі верыць ёй, Лівія, дзе нядаўна перамагла рэвалюцыя, плануе інтэрвенцыю ў Сірыю. У гэтай краіне, як вядома, працягваецца канфрантацыя паміж аўтарытарным рэжымам прэзідэнта Асада і апазіцыяй. На першым этапе, праўда, Трыпалі абмяжуецца пастаўкамі зброі і пасылкай у Сірыю корпусу добраахвотнікаў. Увогуле, Сірыя становіцца своеасаблівым магнітам для ўсіх мілітарных груповак Блізкага Усходу. Таксама сюды для барацьбы супраць Асада накіроўваюцца салафісты з Лівану. Ходзяць чуткі, што яны ўжо пачалі трэніроўкі для атрадаў апазіцыі, якія называюць сябе Свабодная армія Сірыі. Затое на баку Дамаска гатовыя змагацца жаўнеры Іранскай рэвалюцыйнай гвардыі, ісламскія фундаменталісты з іракскай Арміі Махдзі, баевікі «Хесболла». Як кажуць спецыялісты, такая канцэнтрацыя ўзброеных экстрэмістаў рана ці позна абавязкова прывядзе да пераходу канфлікту на новую ступень, якая будзе нагадваць грамадзянскую вайну ў Ліване.

**Паводле брытанскай прэсы**

### ВЕНГРЫЯ. НАШЧАДКІ АТЫЛЫ, ЯДНАЙЦЕСЯ!

З неверагоднай геапалітычнай ініцыятывай выступілі венгерскія ўльтраправыя з партыі Jobbik. Яны нейкім чынам разлічылі, што па Зямлі ходзяць каля 200 мільёнаў нашчадкаў Атылы, правадыра гунаў з 434 па 453 год, што аб'ядналь пад сваёй уладай варварскія плямёны ад Рэйна да Паўночнага Прычарнамор'я. Хаця гісторыкі лічаць Атылу германскім правадыром, актывісты Jobbik запісалі яго ў галоўнага прашчура венграў. Такім чынам, 200 мільёнаў яго нашчадкаў — гэта, на думку венгерскіх правых, таксама ў чымсьці венгры, якія гатовыя аб'яднацца вакол Будапешту. Галоўным чынам, па разліках геапалітыкаў, тыя прапраўнукі Атылы жывуць на землях цюркскіх народаў. Гэта значыць, што знешняя палітыка Венгрыі павінна быць накіравана на Усход на падтрымку дактрыны стварэння вялікага Турану — дзяржава ўсіх цюркаў. Цяжка сказаць, наколькі такая канцэпцыя папулярная сярод простых венграў, аднак рэйтынг партыі Jobbik апошнім часам вырас да 19 працэнтаў. Зараз гэта другая па папулярнасці палітычная сіла ў Венгрыі.

**Паводле венгерскай прэсы**

### ГРУЗІЯ—АРМЕНІЯ. 90 ГАДОЎ МІРУ

Грамадскасць Грузіі і Арменіі актыўна ўзгадвае 90-ю гадавіну Карскай дамовы. Карская дамова 1921 года ўсталявала мір і мяжу паміж Армянскай, Азербайджанскай і Грузінскай ССР з аднаго боку, і Турцыяй — з другога. У адпаведнасці з дамовай, Карс, Ардаган, Паўднёвая Аджарыя адышлі да Турцыі. Святая для армян гара Арарат таксама апынулася на тэрыторыі Турцыі. Дамова дасюль выклікае шмат крытыкі, паколькі па-сутнасці Карская дамова — гэта замацаванне прынцыпаў заключанай раней Маскоўскай дамовы паміж Расіяй і Турцыяй. Тады тайна ад Тбілісі і Эрэвана быў вырашаны лёс дзяржаўных межаў Грузіі, Арменіі і Азербайджана. Праўда, вядома, што на Патсдамскай канферэнцыі, а затым на сесіі Генасамблеі ААН Сталін афіцыйна запатрабаваў ад Анкары вяртання гістарычных грузінскіх і армянскіх земляў. Больш таго, у архівах знойдзеныя сакрэтныя планы наступлення на Трабзон і Карс, распрацаваныя камандаваннем Закаўказскай ваеннай акругі і нават спісы кампартыі Грузіі — кандыдатаў у члены гаркамаў і выканкамаў гарадоў на тэрыторыях, якія планавалася захапіць. Аднак да рэалізацыі планаў з-за далучэння Турцыі да блоку NATO справа не дайшла. Праўда, гісторыя Карсу на гэтым не закончылася. Сучасная Армянская Рэспубліка афіцыйна не прызнае вынікаў Карскай дамовы.

**Паводле грузінскай прэсы**

ЕЎРАІНТЭГРАЦЫЯ

# БУМ ГЕРМАНАФОБІІ

*Алег НОВІКАЎ*

**Паслядоўная жорсткая лінія ўраду Германіі ў пытаннях еўрапейскай фінансавай палітыкі выклікала рэнесанс антынямецкіх настрояў, якіх стары кантынент не бачыў з часоў Другой сусветнай вайны.**



Папулярная інтэрнэт-энцыклапедыя Вікіпедыя артыкул «Германафобія» заканчвае словамі: «Сёння пачуццё нянавісці да немцаў захавалася ў малых сектарах грамадства і, як правіла, у праекцыі на гісторыю Трэцяга Рэйху».

Але з-за цяперашняга крызісу Еўропа перажывае бум германафобіі. Прэса Грэцыі называе Хорста Рэйхенбаха, камісара Еўрасаюза ў справах грэчаскай эканомікі, не інакш як «Трэці Хорст Рэйхенбах». Найджэл Фарадж, дэпутат брытанскага парламенту і адзін з лідараў руху еўраскептыкаў, кажа: «Еўропа зноў жыве пад дыктатам Германіі, што патрабуе цалкам перагледзець еўрапейскі праект».

Найбольш моцныя выкіды антыгерманскай рыторыкі зафіксаваныя ў Францыі. Левая апазіцыя ў асобе некаторых сяброў сацыялістычнай партыі параўнала кіраўніка ФРГ з жалезным канцлерам Ота фон Бісмаркам, у час кіравання якога Германія пазбавіла Францыю статусу вядучай кантынентальнай еўрапейскай дзяржавы.

Такую паралель правёў Арно Мантэбур, адзін з сацыялістычных лідараў. Па выніках нядаўніх праймерыз, якія абіралі кандыдата ад сацыялістаў на прэзідэнцкія выбары, Мантэбур, дарэчы, быў трэцім па папулярнасці сярод аднапартыйцаў. «Яна (Меркель) будуе канфрантацыю, каб у выніку навязаць дамінаванне... Нямецкі нацыяналізм Бісмарка адраджаецца ў асобе фраў Меркель», — лічыць Мантэбур. На яго думку, тое, што робіць Нікаля Сарказі, падобна на паводзіны прэм'ера Эдуара Даладзье. Нагадаем, што напрыканцы 1930-х гадоў французскі міністр Даладзье быў адным з аўтараў Мюнхенскага міру, які, на яго думку, павінен быў цалкам задаволіць постверсальскія комплексы Берліна. Аднак наступствы здачы Чэхаславакіі, як вядома, былі зусім іншымі.

Так, літаральна за хвіліну адрадзіліся забабоны, якімі Еўропа жыла прыкладна сто гадоў таму і якія яшчэ ўчора падаваліся такімі архаічнымі.

З іншага боку, «германафобія» мае даўнюю традыцыю. Найбольш развітая яна ў Францыі, дзе пасля прайгранай вайны з Прусіяй у 1870 годзе на працягу амаль 50 гадоў толькі і казалі, што пра рэванш.

Істэрыя дасягнула сваёй кульмінацыя ў час аферы Дрэйфуса, калі правым паўсюль бачылася сетка нямецкіх шпіёнаў, якая працуе абапіраючыся на сваю 5-ю калону — яўрэяў, масонаў, пратэстантаў і нават прыхільнікаў канцэпцый нямецкага філосафа Эмануіла Канта.

Нават левыя пагаджаліся з тэзісам пра тое, што прускі парадак супярэчыць ідэям дэмакратыі, роўнасці, прыдуманых якабінцамі. З лёгкай рукі Клемансо ўзнік тэрмін «Свяшчэнны саюз» — адзінства ўсіх палітычных сіл у барацьбе з Германіяй.

Дзякуючы таму, што Францыя была сябрам Антанты, напрацаваныя тут клішэ германафобіі хутка былі экспартаваныя ў іншыя краіны кааліцыі, хаця гэта з'ява таксама не была тут навінкай.

Напрыклад, у 1880 годзе ў Англіі патрыёты дабіліся, каб уся нямецкая прадукцыя прадавалася з ярлыкам Made in Germany. Такім чынам яны жадалі ўзняць патрыятычны дух брытанскага спажыўца. Цікава, што тагачасная нямецкая прадукцыя была настолькі добрай якасці, што гэтая мера, наадварот, паспрыяла прасоўванню тавараў з біркай Made in Germany на брытанскі рынак.

Падчас Першай сусветнай вайны антынямецкая паранойя перайшла ўсе рамкі. Узнік вобраз немца як новага гуна.

Другая сусветная вайна, па зразумелых прычынах, яшчэ больш спрыяла росту падобных настрояў у масавай культуры. Пасля вайны стваральнікам Еўрасаюзу давялося шмат папрацаваць над тым, каб замест ксенафобіі прыйшла ідэя агульнай адказнасці за лёс Еўропы. І яны дабіліся свайго. Адпаведна апытанням BBC, немцы маюць самы пазітыўны вобраз у свеце сярод іншых нацый. Параўнайце са статыстычнымі дадзенымі 1940-га, калі толькі 6 працэнтаў брытанцаў лічылі немцаў «адказным народам».

Сёння Еўропа быццам вярнулася ў 1945 год, калі трэба зноў змагацца з ксенафобскімі міфамі.

Елісейскі палац апаратыўна адрэагаваў на апошнія трэнды ў лагеры апазіцыі. Амаль усе дэпартаменты прэзідэнцкай вертыкалі выступілі з асуджэннем. Жан Леанэці, міністр еўрапейскіх спраў, назваў учынкі Мантэбура «германафобскай істэрыкай». Алан Жупэ, дырэктар МЗС, абвінаваціў левых у спробах выклікаць старых дэманаў нянавісці да немцаў. Даў сацыялістам адлуп і сам Нікаля Сарказі. Па яго словах, выразы, якія дазваляюць сябе некаторыя на адрас Меркель, падрываюць «французска-нямецкае сяброўства, якое ёсць часткай палітычнага кансэнсусу французскага палітычнага класу».

Тое, што правыя так моцна захапіліся тэмай германафобіі, звязана з хуткімі прэзідэнцкімі выбарамі. Сарказі нават не хавае надзеі на тое, што, па яго словах, «кожны ў рамках выбарчага календара павінен зразумець адказнасць за драматычную гісторыю адносін нашых краін». Сарказі заслужыў добрых слоў і ад Меркель: «Сарказі нагадвае мне больш дэ Голя, чым Даладзье».

У сваю чаргу, Партыя сацыялістаў прапанавала сваё бачанне сітуацыі. Як сцвярджае П'ер Масковічы, адзін з партыйных бонзаў, «ідзе кампанія дыскрэдытацыі левых сіл, каб выставіць іх антыфранцузамі». Аднак пры гэтым ён раскрытыкаваў прэзідэнта за нядольнасць супрацьстаць Меркель у пытаннях рэформы Еўрапейскага цэнтральнага банку: «Ён (Нікаля Сарказі) патрабуе, а яна (Ангела Меркель) не хоча гэтага. І наадварот, калі яна нешта хоча, ён пагаджаецца. Гэта гратэскная маніпуляцыя».

Пакуль ніякіх прыкмет таго, што нечаканы ўздым германафобіі хутка скончыцца, няма. Хутчэй наадварот. Апошнія фразы Ангелы Меркель пра неабходнасць кардынальнай рэформы ЕС нададуць істэрыцы новы імпульс.

**«Яна (Меркель) будуе канфрантацыю, каб у выніку навязаць дамінаванне... Нямецкі нацыяналізм Бісмарка адраджаецца ў асобе фраў Меркель», — лічыць Мантэбур**

Парадаксальна, аднак у Германіі нацыяналістычная частка палітычнага істэблішменту ахвотна падтрымала падобную крытыку на адрас Германіі. Логіка такой пазіцыі ў тым, каб любым чынам нават праз германафобію спрыяць разбурэнню еўрапейскай інтэграцыі і аднаўленню інстытутаў нямецкай нацыянальнай дзяржавы, перш за ўсё вяртанню да нямецкай маркі.

Так, блізкае да нацыянал-кансерватараў выданне «Berliner Zeitung» сцвярджае: «Германія ператвараецца ў Еўропе ў тое, чым з'яўляюцца Злучаныя Штаты ў свеце. Ці можна казаць пра дэмакратычную Еўропу, калі, кіруючыся інструкцыямі Берліну, Еўропа навязвае краінам зоны еўра эканамічны курс і фактычна замяняе іх урады камісіямі экспертаў?»

МЕРКАВАННЕ

# НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЬ ТОЛЬКІ ПАЧАЛА РАСЦІ

**Парламенцкія выбары ў Расіі называюць часам вяртаннем лібералаў у вялікую палітыку. Партыя «Яблоко», якую даўно палітычна пахавалі, нечакана здолела набраць адносна шмат галасоў. Пра сітуацыю ў лагеры расійскіх лібералаў і сітуацыю ў Расіі пасля думскіх выбараў журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з адным з лідараў партыі «Яблоко» Аляксеем Яблыкавым.**



***— Вы самі ўдзельнічалі ў выбарах, былі на трэцім месцы ў партыйным спісе. Як вы ацэньваеце вынікі галасавання 4 снежня для вашай партыі?***

— Нам ёсць чым ганарыцца. Партыя вельмі добра паказала сябе ў вялікіх гарадах, асабліва ў Маскве і Санкт-Пецярбургу. Найбольш галасоў — 11 працэнтаў — мы сабралі ў Піцеры, дзе акрамя ўсяго прайшлі ў гарадскі парламент. Фракцыю, дарэчы, там узначаліць Грыгорый Яўлінскі. Таксама ў нас будзе свая дэпутацкая група ў Петразаводску. Акрамя таго, па нашых дадзеных, мы сабралі па краіне больш за сем працэнтаў, хаця нам намалявалі толькі тры.

***— Іншымі словамі, вы з самага пачатку ведалі, што выбары будуць падтасаванымі?***

— Мы ішлі на выбары, ведаючы пра тое, што яны будуць несправядлівымі і несумленнымі. Аднак тое, што ўлада будзе паводзіць сябе так нахабна, мы нават не ўяўлялі. На мінулых выбарах узровень фальсіфікацыі складаў прыкладна 15–20 працэнтаў. Як правіла, вынікі галасавання падраблялі падчас перадачы дадзеных з мясцовых выбарчых камісій у рэгіянальныя і цэнтральныя. Зараз, па нашых падліках, было сфальсіфікавана да 70 працэнтаў. Таксама змяніўся механізм фальсіфікацыі. Цяпер мы маем мноства фактаў, калі ў скрыні кідалі падробленыя бюлетэні. Рабілася гэта, як правіла, перад пачаткам працы выбарчых участкаў, прычым вельмі нахабна. Так, на адным з участкаў Ніжагародскай вобласці, дзе па спісах 1200 выбаршчыкаў, 4 снежня прагаласавала 1600. Другім сродкам фальсіфікацыі стала так званая "карусель". Часам на ўчастках нават не хапала талонаў для галасавання не па месцу пражывання. Па Маскве ў дзень галасавання рухалася вялікая армія сябраў праўладнай моладзевай групоўкі «Нашы», якія галасавалі на розных участках. Нават вядомая такса за такую «працу» — 400 рублёў (каля 13 долараў ) за адно галасаванне.

***— Ці можна сказаць, што зараз «Яблоко», а не Нямцоў або Лімонаў ці «Правое дело», — галоўны ліберальны полюс апазіцыі Пуціну?***

— Пра партыю «Правое дело» ўвогуле няма чаго казаць. Гэта партыя падстаўных прагрэмлёўскіх лібералаў. Што тычыцца Нямцова і блізкай яму групы, то яны заклікалі байкатаваць выбары, кідаючы ў скрыні несапраўдныя бюлетэні. Аднак, думаю, працэнт такіх бюлетэняў вельмі малы. Таксама мала людзей адгукнулася на заклік Лімонава ісці 4-га на вуліцы. У сённяшняй Расіі пратэст выказваюць не шляхам таго, што псуюць бюлетэнь, а праз пратэстнае галасаванне. Інакш цяжка зразумець феномен «Справядлівай Расіі», якая нечакана ўзяла амаль удвая больш галасоў, чым на мінулых выбарах. Гэтую партыю напярэдадні выбараў пазбавілі адміністратыўнага рэсурсу, спрабавалі маргіналізаваць. А на выхадзе электарат на зло Крамлю прагаласаваў за эсэраў.

***— Што вы можаце сказаць пра вынікі «Адзінай Расіі»?***

— Здавалася б, фантастычная лічба ў 49 працэнтаў на самай справе аказалася правальнай. Яна сведчыць, што сітуацыя змянілася. Пайшла незадаволенасць. І гэта незадаволенасць толькі пачала расці, паколькі ўсё адбываецца ў клімаце падрыхтоўкі да прэзідэнцкіх выбараў, якія пройдуць праз тры месяцы. І атрымліваецца фантастычная перспектыва. У нас ёсць магчымасць змяніць уладу легальнымі сродкамі. Галоўнае цяпер, каб Пуцін на выбарах не атрымаў больш за 50 працэнтаў у першым туры. Тады ў другім апазіцыя можа аб'яднацца вакол альтэрнатыўнага кандыдата і перамагчы.

***— Вы можаце назваць прозвішча такога адзінага альтэрнатыўнага кандыдата?***

— Пакуль не. Думаю, што такі кандыдат абавязкова з'явіцца.

***— Калі меркаваць па выніках думскіх выбараў, патэнцыйна другім будзе Генадзь Зюганаў. Яго партыя прыйшла другой з 20 працэнтамі. Няўжо апазіцыя здольна аб'яднацца вакол такой супярэчлівай фігуры як лідар камуністаў?***

— Не факт, што Зюганаў зможа стаць франтмэнам агульнай антыпуцінскай апазіцыі. Поспех эсэраў прадэманстраваў стомленасць насельніцтва не толькі ад партыі ўлады, але і ад старой апазіцыі. Людзі стаміліся таксама ад камуністаў, якія 15 гадоў у апазіцыі толькі і робяць, што крытыкуюць і згадваюць пра часы СССР. Аднак я думаю, што нават супярэчлівы Зюганаў лепш у гэтай сітуацыі, чым Пуцін. Грамадства стамілася ад застою апошніх гадоў.

***— А як наконт таго, каб выставіць адзінага кандыдата ад дэмакратаў?***

— Ужо зараз у прэсе пачаўся пошук такога кандыдата. Аднак гэта цяжкі працэс, паколькі ліберальная апазіцыя доўгі час была герметычнай і не мела яснай перспектывы. У такіх умовах уся энергія ішла на ўнутраныя разборкі, пошукі крамлёўскіх шпіёнаў. Так, група Нямцова сцвярджае, што мы выконваем нейкую ролю ў гульнях крамлёўскіх паліттэхнолагаў, каб адцягнуць людзей ад радыкальных патрабаванняў. Відавочна, нам будзе цяжка весці дыялог з гэтай групоўкай.

***— Ці можа Яўлінскі стаць галоўным кандыдатам ад дэмакратычнай апазіцыі?***

— Я магу сказаць толькі тое, што ён дакладна будзе балатавацца. Так вырашыў партыйны камітэт. Аднак пры гэтым «Яблоко» гатова абмяркаваць іншых кандыдатаў ад дэмакратычнай апазіцыі. Мы прапануем правесці праймерыз, у якім бы прынялі ўдзел усе дэмакратычныя партыі, арганізацыі і рухі незалежна ад таго, ці маюць яны рэгістрацыю. Аднак «Яблоко» адмаўляецца дапускаць да праймерыз экстрэмістаў, нацыяналістаў і радыкальных левых.

***— Ці зрабіла ўлада выснову са свайго канфузу? Як яна будзе паводзіць сябе на працягу наступных трох месяцаў?***

— Ніякіх урокаў улады, здаецца, не зрабілі. Партыйныя функцыянеры «Адзінай Расіі» сцвярджаюць, што вынікі выбараў 4 снежня варта лічыць перамогай, бо іншыя партыі, кажуць яны, набралі яшчэ менш галасоў. Адначасова АР абяцае зрабіць усё магчымае, каб на прэзідэнцкіх выбарах 2012 года Уладзімір Пуцін перамог у першым туры. З улікам такой лексікі, відавочна, што пакуль нічога мяняць не будуць. Максімум — Пуцін возьме дыстанцыю ад «Адзінай Расіі», якую не любяць на месцах. А калі нічога прынцыпова не мяняць, то адзіны сродак забяспечыць патрэбны вынік — яшчэ больш інтэнсіўна выкарыстаць адміністратыўны рэсурс, манаполію на інфармацыю, падкантрольны выбаркам, які можа рэгістраваць непрахадных кандыдатаў. І, натуральна, усё тыя ж фальсіфікацыі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МАЙКЛ ФЕРГЮСОН




Новыя генеральны пракурор Канады быў прызначаны на гэтую пасаду кансерватыўным урадам і будзе займаць яе аж 10 гадоў. Фігура Фергюсона выклікала шмат пратэстаў грамадскасці. Справа ў тым, што ў працэсе прызначэння кансерватары праігнаравалі адно важнае патрабаванне закона і звязаныя з гэтым пратэсты абуранай апазіцыі. Апошняя нагадвала, што Фергюсон не мае права прэтэндаваць на такую высокую дзяржаўную пасаду, паколькі ён не валодае другой дзяржаўнай мовай краіны — французскай. Тым не менш урад паспяхова працягнуў кандыдатуру генеральнага аўдытара праз Палату абшчын, не зважаючы на байкот, абвешчаны апазіцыйнымі лібераламі. Па словах аднаго з апазіцыйных парламентарыяў, прызначэнне Фергюсона стала небяспечным трэндам падрыву мадэлі канадскай мультыкультурнасці. Між тым, гісторыя Фергюсона выклікала вялікі рэзананс на Украіне, дзе шматлікія рускамоўныя намагаюцца ігнараваць закон аб абавязковым веданні ўкраінскай мовы. На іх думку, Фергюсон — добры прыклад таго, што для чыноўніка прафесіяналізм больш важны за мову.

### УЛАД ФІЛАТ



Прэм'ер-міністр Малдовы, які кіруе ад імя кансерватыўнай кааліцыяй «Альянс за еўрапейскую інтэграцыю», нечакана для сябе стаў вядучым прапагандыстам садаміі ў краіне. Такі імідж намагаецца яму зрабіць праваслаўная царква. Царква сцвярджае, што «Філат любым коштам імкнецца «садамізаваць» Рэспубліку Малдова. Непасрэднparam прычынай для такой катэгарычнай заявы стала пазіцыя прэм'ера наконт ідэі рэгістрацыі ў Малдове мусульманскай лігі і наконт Закона супраць дыскрымінацыі. Урад не супраць першага і другога, і гатовы прапанаваць парламенту адпаведныя законапраекты. У выніку малдаўскія мусульмане атрымаюць права будаваць у краіне мячэці, што, на думку мясцовых праваслаўных, непрымальна. Закон супраць дыскрымінацыі яшчэ больш радыкальны. Дакумент легалізуе аднаполыя шлюбы і дазваляе сэксуальным меншасцям усынаўляць дзяцей. Такой ступені свабоды сэксуальныя меншасці не маюць ні ў адной краіне Усходняй Еўропы. Па версіі царкоўнікаў, за льготы гомасексуалістам Філат быццам павінен атрымаць ад Брусэля еўрапейскія гранты. Зараз святары заклікаюць хрысціян маліцца за кіраўнікоў краіны, каб «Бог прасвяціў іх розум і перашкодзіў прасоўванню садаміцкага закона».

### ЯКАБ ЗУМА



Прэзідэнт Паўднёвай Афрыканскай Рэспублікі (ПАР) падтрымаў ідэю новай назвы сталіцы дзяржавы. Пачынаючы з 2012 года Прэторыя будзе называцца Тхване. Горад Прэторыя быў заснаваны ў 1855 годзе бурскім палітыкам Андрысам Прэторыусам, пад кіраўніцтвам якога буры разбілі мясцовыя плямёны зулусаў у слаўтай бітве на Блод Рывер. Доўгі час такая назва не выклікала пратэстаў. Пакуль не знік рэжым апартэіду і да ўлады не прыйшла партыя Афрыканскі нацыянальны кангрэс, якая абараняе правы чарнаскурай большасці ПАР. Лідары АНК упэўненыя, што Прэторыя павінна называецца Тхване на гонар лідара тых самых зулусаў, якія разбіў Прэторыус. Цікава, што на самай справе Прэторыя называецца Тхване яшчэ з 2005 года, калі муніцыпалітэт прыняў адпаведную рэформу. Аднак тады ніхто не ўспрыняў ідэю перайменавання ўсур'ёз. Другі пікантны момант — на мове некаторых этнасаў, якія жывуць у ПАР, Тхване значыць «малпа».

ЦІКАВА

# ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ

## (ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ ЭСЭ)

**Працяг. Пачатак у №№42–45.**

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

**Паводле дакументальных крыніц, іншых матэрыялаў, змешчаных у кнігах, часопісах, газетах, навуковых зборніках, паспрабую ўзнавіць па днях і гадзінах хроніку важнейшых падзей, звязаных з забойствам генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ.**

### Хроніка падрыхтоўкі

Апошняя, вельмі насычаная рознымі падзеямі фаза падрыхтоўкі да забойства Кубэ паводле дакументальных крыніц, пачалася 1 верасня 1943 года.

1 верасня (серада). Пачалася аперацыя пад назвай «Кабан». Пра гэта піша сястра Алены Мазанік В.Р. Шчуцкая ў сваёй справаздачы на Лубянцы ў Маскве.

2 верасня (чацвер). Сувязныя партызанскага атрада «Дима» дакладваюць пра становішча спраў у Мінску, пасля чаго камандаванне атрада абмеркавала і прыняло рашэнне па знішчэнню Кубэ.

3 верасня (пятніца). Камандзір партызанскага атрада «Дима» М.П.Фёдараў піша, што аперацыя «Кабан» пачалася 3 верасня.

4–7 верасня. У партызанскім атрадзе «Дима», паводле дакладаў сувязных і разведкі, якія дзейнічалі ў Мінску, рабілі высновы, як выйсці на асабняк, дзе жыве Кубэ, ці на Генеральны камісарыят Беларусі, дзе ён працуе. Складалі планы, схемы розных маршрутаў: выхад Кубэ на працу (калі ён пешшу хадзіў у будынак, дзе размяшчаўся да вайны ЦК КП(б) Беларусі, а ён жыў побач у асабняку, дзе да вайны і пасля вайны мясціўся Саюз пісьменнікаў БССР).

8 верасня (серада). На Алену Мазанік выйшла Осіпава, якая ў сакрэтных уліковых дакументах НКУС і ГРУ ГШ Чырвонай арміі фігуравала як «Марыя Чорная» ці проста «Чорная». Гэта сустрэча была арганізавана дырэктарам кінатэатра Мінска Мікалаем Васілевічам Пахлябаевым. У першыя дні вайны ён быў цяжка паранены, у беспрытомным стане трапіў у палон і быў змешчаны ў Мінскі шпіталь для ваеннапалонных. Пасля выздараўлення пры дапамозе медсястры Пахлябаеў уцёк з бальніцы. Пазней яму ўдалося ўладкавацца на працу ў кінатэатр, дзе ў хуткім часе ён стаў дырэктарам.

Паводле папярэдняй дамоўленасці, на сустрэчу з Осіпавай павінна была прыйсці Мазанік і яе родная сястра Валянціна Рыгораўна Шчуцкая, якая працавала ў казіно. Але ў прызначаны час сёстры на спатканне не прыйшлі. Осіпава выказала Пахлябаеву сваю занепакоенасць з нагоды нядобранадзейнасці «Галі» (партызанскі псеўданім Мазанік), бо ў яе мелася інфармацыя пра тое, што «она с немцами гуляет».

Наступная сустрэча была арганізавана падпольшчыкам Георгам (Жоржам) Куліковым і Пахлябаевым.

9 верасня (чацвер). Адбылася сустрэча Мазанік з Осіпавай. Мазанік настаяла на сустрэчы з кіраўніцтвам партызанскага атрада «Дима». Осіпава дала згоду. А Мазанік, спаслаўшыся на занятасць, сказала, што замест яе ў партызанскі атрад пойдзе яе сястра — Валянціна Шчуцкая.

10 верасня (пятніца). У 6 гадзін раніцы Валянціна Шчуцкая сустрэлася з Осіпавай, і яны пайшлі ў партызанскі атрад «Дима».




Спальня Кубэ пазначана Аленай Мазанік



Алена Мазанік і яе сястра Валянціна Шчуцкая

11 верасня (субота). Осіпава і Шчуцкая вярнуліся з партызанскага атрада «Дима». Шчуцкая сама ўбачвайдкі ўпэўнілася, што партызанскі атрад «Дима» быў сапраўдны, бо ілжэатрады часта арганізоўвалі немцы.

13 верасня (панядзелак). Осіпава сустрэлася з падпольшчыкам Уладзімірам Сібко і перадала яму свежыя савецкія газеты, якія яна прынесла з партызанскага атрада «Дима». Потым, паводле дамоўленасці, пайшла на сустрэчу з Мазанік і Шчуцкай, але яны ў прызначаны час не з'явіліся. Пачакаўшы нейкі час, каб не выклікаць лішняй цікаўнасці да сваёй асобы, Осіпава пайшла дадому.

14 верасня (аўторак). Мікалай Пахлябаеў у 18.00 зноў сустрэўся з Осіпавай. На сустрэчы было прынята рашэнне ліквідаваць Кубэ, падклаўшы міну ў яго кабінет ці спальню. Ад першага плана ліквідацыі Кубэ пры дапамозе атруты вырашылі адмовіцца, бо ў доме першымі прымалі ежу яго малыя дзеці. Дарэчы, пры заключным вобыску ў Марыі Дубровай (цёткі Алены Мазанік) былі знойдзены схаваныя паміж дошкамі пакецікі з пяццю паперовымі аблаткамі, якія ўтрымлівалі стрыхнін. Можна амаль з 100-працэнтнай упэўненасцю зрабіць выснову, што ў выпадку няўдалага замаху з мінай, уся сям'я Кубэ была б атручана стрыхнінам. Колькасць знойдзенай атруты хапіла б, каб атруціць звыш 100 чалавек. І пры дапамозе Шчуцкай, якая працавала на кухні нямецкага суда, мелася магчымасць падмяшаць атруту.

16 верасня (чацвер). Осіпава, паводле дамоўленасці, накіравалася на сустрэчу з Мазанік, папярэдне паклаўшы ў сетку загорнутую ў газету міну і прыкрыўшы яе зверху парнавымі туфлямі. Мазанік на сустрэчу не з'явілася. Псіхалагічны стан Осіпавай быў на мяжы зрыву. Аказваецца, Мазанік не прыйшла на сустрэчу таму, што ў гэты дзень Кубэ ад'язджаў у камандзіроўку, і яго трэба было сабраць у дарогу.

Мінскія падпольшчыкі ў той дзень арганізавалі выбух у нямецкім казіно, якое знаходзілася ў памяшканні авіяцыйнай часці на вуліцы Акадэмічнай. У выніку выбуху двух мін знішчаны дзясяткі афіцэраў. Пасля гэтага тэрарыстычнага акту было расстраляна 300 чалавек.

На цэнтральным аэрадроме Мінска падарвалі інтэрнат лётнага складу. Было забіта 40 і паранена 30 нямецкіх лётчыкаў. Падпольная арганізацыя «Андруша» (кіраўнік М.А.Кедышка) стварыла спецгрупу, якая займалася «паляваннем» на гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Паводле няпоўных звестак, на вуліцах Мінска ёю было знішчана звыш 50 акупантаў і іх памагатых. Нямецкі генерал Шнерлінг быў вымушаны прызнаць, што ў Мінску ад рук падпольшчыкаў і патрыётаў загінула звыш 1600 акупантаў.

19 верасня (нядзеля). Адбылася чарговая сустрэча Осіпавай і Мазанік на яе кватэры. Мазанік паведаміла, што жонка гаўляйтара Аніта ў аўторак паедзе на рынак за прадуктамі і, магчыма, у гэты дзень складзецца спрыяльная сітуацыя для закладкі міны. Так яно ў далейшым і атрымалася.

20 верасня (панядзелак). Вечарам адбылася кантрольная сустрэча, на якой Мазанік атрымала ад Осіпавай міну. Вось як апісвае гэты эпізод А.Р.Мазанік:

«В моей комнате стенки были тонкие, нам приходилось разговаривать шепотом — с одной стороны жил полицай, да и другой сосед тоже был ненадежный. Мария ко мне пришла якобы для того, чтобы купить туфли. Она их начала примерять, ходить по комнате и торговаться. Я просила двести марок, она давала сто, потом сто пятьдесят. Торговались мы примерно минут сорок, за это время она вынула мину и проинструктировала меня, как ее завести. Но, видимо, она сама плохо знала, как это делается, в мину никак не входил замыкатель, и мы ножом пытались расширить паз. Валентина в то время пела песни и уговаривала меня продать туфли… Наконец все было готово. Я положила мину под матрац, и мы сели на кровать — попробовали, не чувствуется ли мина. Оказалось, что не чувствуется, и мы пришли к выводу, что это надежный способ отправить на тот свет господина Кубе. Затем мы с Марией быстро «сошлись в цене» за туфли. Мария громко отсчитала деньги, завернула туфли и, выходя, сказала: «Все же переплатила я за туфли. Но что делать, они мне очень понравились!» После ухода Марии сосед-полицай спросил меня, что это за новая женщина была у меня. Я ответила, что она купила у меня туфли.

Мину я сначала положила в печку, там она пролежала до темноты. В час ночи я принесла ее в комнату. Завести ее нужно было в два часа ночи, с тем чтобы она взорвалась в два часа ночи на следующий день. В два часа ночи я завела мину и положила ее под подушку. Вдвоем с Валей мы легли на кровать — если взорвется, погибнем вместе. Ведь если бы она взорвалась без нас, все равно нам грозила гибель».

21 верасня (аўторак). У 3 гадзіны раніцы міна была заражана на кватэры, дзе жыла Мазанік. У 6 гадзін раніцы Мазанік, паклаўшы ў сумку міну, накіравалася ў апошні раз на працу ў дом Кубэ. З сястрой у Мазанік была дамоўленасць аб тым, што калі раптоўна ў доме Кубэ з'явіцца гестапа, то гэта будзе азначаць, што аперацыя правалілася.

У 7 гадзін раніцы з Мінска Осіпава вывезла сям'ю Мазанік-Шчуцкай, сваякоў Валянціны ў партызанскі атрад «Дима».

Пры ўваходзе ў дом Кубэ прыслугу заўсёды абшуквалі. Але ў гэты дзень, на шчасце Мазанік, дзяжурыў салдат, з якім яна была ў добрых адносінах. Вобыск прайшоў фармальна.

Прыйшоўшы ў свой пакой, Мазанік пераапранулася, міну падвязала пад сукенку ніжэй грудзей, надзела фартух, але не завязала яго ззаду, а пакінула так, каб ён звісаў свабодна — так міна была зусім непрыкметнай. Вось так Мазанік хадзіла з мінай да 10 гадзін раніцы.

У 9 гадзін раніцы В.Кубэ, яго жонка і дзеці прачнуліся. Кубэ, сустрэўшы Мазанік на лесвіцы, пацікавіўся, чаму ў яе такі бледны твар. Тая адказала, што ў яе баліць зуб, што не спала ўсю ноч, і папрасіла дазволу пайсці да зубнога ўрача, а на работу ў гэты дзень болей не прыходзіць. Кубэ распарадзіўся, каб яе адвялі да нямецкага стаматолага. Дарэчы, з усіх, хто абслугоўваў Кубэ, ёй адной было дазволена лячыцца ў нямецкага ўрача.

Пасля снядання Кубэ са сваім ад'ютантам Карлам Вільдэнштэйнам паехаў на службу. Аніта з малодшым сынам Вілі паехала на рынак. Два старэйшых сына Геральд і Пітэр (будучы вядомы аўтагоншчык Перу) адправіліся ў школу на заняткі.

У доме засталіся пакаёўкі Яня і Стэфа, паварыха Домна (у мінулым была поварам у графа Патоцкага) і дзяжурны афіцэр СД, які з раніцы да позняй ночы дзяжурыў ля тэлефона. Яго пакой знаходзіўся якраз насупраць спальні Кубэ. Ён вельмі рэдка пакідаў свой пост, асабліва калі Кубэ і Аніты не было дома.

БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

# ДАСЛЕДЧЫЦА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З АЁВЫ

**Застаць дома доктара філалогіі, выкладчыцу кафедры сучасных моваў Універсітэта Паўночнай Аёвы ў горадзе Сідар Фолс штата Аёва ў ЗША беларуску Аліцыю Барута-Садкоўскі вельмі цяжка. Але журналісту «НЧ» Сяргею Чыгрыну ўсё ж удалося сустрэцца з даследчыцай.**


Аліцыя Барута-Садкоўскі з сынам

Нядаўна Аліцыя была ў Маскве. З Масквы вярнулася дамоў, у Сідар Фолс, але зноў яе чакаюць справы выкладчыцкія, справы навукоўцаў-славістаў то ў Еўропе, то ў Канадзе на гадавым з'ездзе Таварыства амерыканскіх славістаў, то ў іншых краінах і кантынентах. І каб пагутарыць хаця б па тэлефоне ці праз інтэрнэт, нашу зямлячку трэба было шукаць заўсёды. Так я і рабіў некалькі тыдняў і нават месяцаў, пакуль нарэшце не дачакаўся ад яе весткі. Спадарыня Аліцыя пагадзілася адказаць на мае пытанні і перадала самыя шчырыя прывітанні ўсім беларусам.

***— Спадарыня Аліцыя, дзе і ў якой сям'і вы нарадзіліся?***

— Я нарадзілася ў Гайнаўцы на Беласточчыне 27 сакавіка 1961 года. Мой бацька быў родам з вёскі Скупава, але, калі ажаніўся, жыў у Гайнаўцы. Яго ўжо няма ў жывых, ён памёр у 1982 годзе. Мама родам з Ласінкі. Яна, дзякаваць Богу, яшчэ жыве ў Гайнаўцы. Мама і тата ў хаце заўсёды размаўлялі на роднай беларускай мове з мясцовым дыялектам. У іх і я навучылася роднай мове, якую берагу ў сэрцы да сённяшніх дзён.

Пачатковую і сярэднюю адукацыю я атрымала ў Гайнаўцы. Скончыла ў Гайнаўцы беларускі ліцэй. Затым паступіла ў Варшаўскі ўніверсітэт на факультэт беларуска-рускай філалогіі, дзе ў 1985 годзе атрымала ступень магістра. Тэмай магістэрскай працы з'явіліся польска-беларускія літаратурныя адносіны ў першай палове 1980-х гадоў, што потым паўплывала на тэму маёй доктарскай працы.

***— А які лёс вас закінуў ажно ў Амерыку?***

— Калі вучылася ў Варшаве, пазнаёмілася са сваім будучым мужам Конрадам. Ён родам з Польшчы, але ўсё жыццё яго бацькі, браты і ён жывуць у ЗША. Таму пасля заканчэння ўніверсітэта я паехала да яго, і ў 1987 годзе выйшла замуж. Адсюль у мяне цяпер і два прозвішча: Барута-Садкоўскі. Муж мой — гісторык, выкладае гісторыю Еўропы. У нас растуць два сыны — Бен, яму 17 гадоў, і Карол, яму 15 гадоў.

У 1988 годзе я паступіла ў Мічыганскі ўніверсітэт у горадзе Ан-Арбор штата Мічыган на кафедру славянскіх моваў і літаратур, дзе ў 1997 годзе атрымала ступень доктара філалогіі.

Па-беларуску тэма маёй доктарскай дысертацыі гучыць так: «Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў 1920-х і 1930-х гадах на падставе гарадскіх варыянтаў Гародні, Вільні і Менска і ўплыў рускай і польскай моваў на гэта развіццё». На англійскай мове гэта тэма гучыць неяк не так доўга, як па-беларуску.

***— Чым вы займаліся пасля абароны доктарскай дысертацыі?***

— У 1995 годзе я з сям'ёй пераехала ў Аёву ў горад Сідар Фолс, дзе цяпер працую ва ўніверсітэце Паўночнай Аёвы, вяду заняткі па рускай і польскай мовах, па рускай і польскай літаратуры і агульныя заняткі па гісторыі Расіі, а таксама працягваю свае даследаванні ў галіне беларускай мовы. Часта ўдзельнічаю ў краёвых і замежных канферэнцыях, дзе выступаю з дакладамі пра беларускую літаратурную мову. Прымала ўдзел у Першым і Другім міжнародных кангрэсах у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка і ў Трэцім міжнародным кангрэсе беларусістаў. З'яўляюся сябрам краёвых і замежных беларусістаў і славістаў. Публікую артыкулы пра развіццё беларускай літаратурнай мовы 1920-х і 1930-х гадоў.

У жыцці мы размаўляем на польскай мове, але мае сыны ведаюць і беларускую мову, хоць не так дасканала, як я, але ж ведаюць. Ды і мне самой цяпер даводзіцца рэдка размаўляць на сваёй роднай мове, часцей за ўсё падчас беларускіх сустрэч, навуковых канферэнцый і г.д. Але, шчыра скажу, Беларусь і беларусы для мяне вельмі блізкія. Кожны раз, калі бываю ў Мінску, мне здаецца, сустракаюся з такой цеплынёй, якую чалавек атрымлівае толькі ад самых блізкіх людзей. Уладзімір Васілевіч, мой дарагі сябра, з якім вы таксама знаёмыя, і які калісьці прыязджаў у Сідар Фолс і прачытаў даклад пра беларускую этнаграфію, заўсёды мне дапамагае, калі я ў Мінску.

***— А ці часта бываеце ў Гайнаўцы на Беласточчыне?***

Амаль кожны год я з мужам прыязджаем у Кракаў, дзе муж вядзе заняткі па гісторыі, а я выкладаю польскую мову. А летам мы едзем у Гайнаўку да маёй мамы. Вось і сёлета ў чэрвені зноў наведалі маму. Асабліва ў Гайнаўцы любяць бываць мае сыны. А я — тым болей, я ж прыязджаю дадому, дзе чую голас мамы, сваякоў і родную мову.

СЯМЕЙНЫ АРХІЎ

# СЯБРЫ НА ФОТАЗДЫМКАХ

Сяргей ЧЫГРЫН

**Жыў на Гродзеншчыне цікавы чалавек — педагог, краязнавец і музеязнавец Міхась Петрыкевіч (1913–1999). На жаль, у Беларусі сёння такіх людзей не ўшаноўваць, не ганарацца імі. А такім, як Міхась Петрыкевіч, трэба ставіць помнікі, адкрываць мемарыяльныя шыльды, выдаваць пра іх кнігі.**


Міхась Петрыкевіч у сярэдзіне старога дуба (не захаваўся). З другога боку фотаздымка напісана: «Дарагі Міхале! Будзь такі малады і вясёлы, як на гэтым фотаздымку. Што варты твае пяцьдзесят гадоў у параўнанні з тысячай гэтага свіцязянскага волата? Праўда, тысяча — не чалавечы век, але гледзячы на такіх статных старцаў, sto lat можна пражыць не старэючы. Гэтага табе ад усёй душы жадаем мы з Соняй. Ул. Калеснік»


Міхась Петрыкевіч

Міхась Петрыкевіч нарадзіўся на Навагрудчыне. Пасля пачатковай школы і двухгадовай школы паступіў у Навагрудскую беларускую гімназію. У 1940–1941 гадах вучыўся на літаратурным факультэце Беластоцкага педінстытута. З пачаткам вайны вярнуўся дамоў. Потым яго забралі на фронт. А пасля вайны давучваўся ў Мінскім педінстытуце.

Усё жыццё Міхась Петрыкевіч працаваў настаўнікам роднай мовы і літаратуры ў Карэліцкай сярэдняй школе, у Валеўскай сярэдняй школе на Навагрудчыне. У Валеўскай школе ён стварыў народны краязнаўчы музей. А калі пераехаў у Дзятлава, арганізаваў у 1967 годзе Дзятлаўскі раённы краязнаўчы музей, які існуе да сённяшніх дзён. З 1967 года Міхась Петрыкевіч друкаваў у рэспубліканскіх газетах і часопісах артыкулы на розныя краязнаўчыя тэмы. Вельмі шчыра сябраваў з беларускімі пісьменнікамі, асабліва з Уладзімірам Калеснікам, Уладзімірам Караткевічам, Янкам Брылём, Фёдарам Янкоўскім, Янкам Скрыганам і многімі іншымі.


На замкавай гары ў Навагрудку Фёдар Янкоўскі, Янка Скрыган і Міхась Петрыкевіч, 1960 год

Нядаўна ў Дзятлаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі з'явілася Кніга славы. Кніга «Памяць» тут ёсць ужо даўно, а гэта — Кніга славы. Салідная такая, добра аформленая. На аднаго славутага чалавека раёна адведзена адна старонка. Нічога не маю супраць: усе людзі, пра якіх там напісана і змешчаны фота, варты павагі. Крыўдна другое: там не знайшлося месца для Міхаіла Фёдаравіча Петрыкевіча, які быў заслужаным настаўнікам Рэспублікі Беларусь і шмат зрабіў для гісторыі Дзятлаўшчыны і Навагрудчыны.

Разам з сынам Міхася Петрыкевіча Валерыем запланавалі сабраць лепшыя краязнаўчыя публікацыі краязнаўца Гродзеншчыны, а таксама артыкулы пра яго і фотаздымкі, і выдаць асобнай кніжкай. Чытачам «НЧ» прапаную вельмі рэдкія фотаздымкі з фотаархіва Міхася Петрыкевіча. Усе фотаздымкі друкуюцца ўпершыню. І апошняе. Калі пісаў гэтыя радкі, прыгадаліся словы Янкі Брыля з ягоных запісаў «Ляцела зязюля...»: «Раптам у памяці весела засмяяўся Міхась Петрыкевіч, і падумалася, як гэта кожны з сяброў свой смех — яго энергію, успышкі радасці жыцця — панёс у беззваротнае кудысьці».

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

### Орыкс — пяшчотны і спакойны хлопчык



Кацянё вельмі прыгожага колеру «віскас» — срэбра ў палосачку, яму паўгода, прызвычаены да латочка, есць сухі корм.

Орыкс вельмі любіць увагу і ласку, але сціплы і ненавязлівы. Цудоўна ладзіць з іншымі катамі. Чакае свайго самага лепшага ў свеце гаспадара ў прытулку СуперКот, куды патрапіў з пункта адлову на Гурскага. Самы лепшы гаспадар — гэта вы? Тады тэлефануйце валанцёрам!

+375 29 199 99 15, +375 44 722 40 09, +375 29 508 26 24

### Мішутка — залаты сабака са складаным лёсам

Гаспадар у Мішуткі быў добры і клапатлівы, але так здарылася, што ён памёр. А сабаку выгналі на вуліцу. Некалькі месяцаў Мішка бадзяўся па дварах, неаднаразова на яго выклікалі адлоў, але неабыякавыя людзі «адбівалі» Мішку ад жывадзёраў.

Зараз сабака ў часовым доме. І павозіць сябе проста выдатна — нічога не псуе, не енчыць, трывае да прагулкі.



Мішутка адпавядае сваёй мянушцы — ён калматы і вялікі, 55 сантыметраў ростам. А яшчэ ў яго глыбокія і вельмі разумныя карыя вочы. Здаецца, ён ведае шмат болей за нас, і вельмі хоча падзяліцца гэтымі ведамі са сваім гаспадаром. Тэлефануйце!

+375 29 232 13 31 Ірына

Болей катоў і сабак — у каталогах на www.forum.superkot.com

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# У ПОШУКАХ ДУШЫ КАРАТКЕВІЧА

Андрэй РАСІНСКІ

**Віктар Корзун і Кася Камоцкая прадставілі дакументальную стужку пра песняра.**

«Як сканаю — душа застанецца», — гучалі словы Караткевіча ў апошнія восеньскія выходныя. У мінскай Галерэі «Ў» гледачы маглі пабачыць новую карціну пра чалавека, які стварыў сучасную Беларусь. Стужка так і называецца: «Уладзімір Караткевіч: Як сканаю — душа застанецца».

Маленькая зала была забітая; філосаф Валянцін Акудовіч, адзін з удзельнікаў фільму, пнуўся пабачыць, што адбываецца на экране, але гледачы — ім не хапіла месцаў — стаялі шчыльна.

Караткевіч прыдумаў Беларусь. Беларусь-мару, Беларусь сонечную і шляхотную, Беларусь, асвечаную сівой, цікавай гісторыяй і сонечным прышлым. Пра гэтыя мары Караткевіча распавядалі Адам Мальдзіс і Васіль Сёмуха, Рыгор Барадулін і Андрэй Хадановіч, Вітаўт Мартыненка і Генік Лойка.




Распавядаў і сам Караткевіч: стваральнікі стужкі знайшлі рэдкія кадры 50-годдзя пісьменніка, калі яго віншавалі сябры і афіцыйныя асобы; пад самыя бюракратычныя прамовы Караткевіч хітра падліваў келіх Васілю Быкаву.

Гучалі вершы-песні Караткевіча. «Як памру — душа застанецца», — спявала Кася Камоцкая. Спяваў Андрэй Мельнікаў пад акорды гітары.

Рэжысёр Віктар Корзун стварыў кадры, якія надзвычай пасуюць эстэтыцы Караткевіча: святло ад вогнішчаў ля начных муроў, бялявыя начныя матылькі, што ляцяць на полымя, людскія твары, поўня.

Увасобленыя пластыкай кінамовы вершы паэта паказвалі зіхоткую, рамантычную Беларусь. Але ці ўвасобілася гэта Беларусь сёння, праз колькі гадоў па смерці пісьменніка? І што рабіць з натхнёнай рамантыкай, калі прыходзяць прагматыкі?

На гэтыя пытанні паспрабавалі адказаць у фільме Віктар Корзун і Кася Камоцкая. Мары Караткевіча сутыкаюцца з амонаўцамі, якія з дубінкамі лезуць у кадр (хаця стужка зусім не пра іх); самі аматары Караткевіча сабраліся ў напаўпадпольнай галерэі; паўсюдная — руская мова.

Але Беларусь — ужо незалежная. Але Караткевіч — найпапулярнейшы пісьменнік краіны. Але рамантычныя перабольшванні паэта — сёння ўспрымаюцца не ўсімі, але многімі, як звыкласць і норма.

Лятуць і лятуць дрыготкія матылі. Гучыць песня пад старажытнымі мурамі. Іскры ад вогнішча сягаюць да неба.

Душа Караткевіча засталася. Краіна, якую ён прыдумаў, усё яшчэ адбываецца.


## ЦЕНІ ГУКУ

**12–14 снежня праект Cinemascope прадстаўляе ў кінатэатры «Перамога» праграму «Цені гуку», якая прысвечана класіцы гукавога кінематографа і ажыццяўляецца пры падтрымцы Пасольства Германіі ў Рэспубліцы Беларусь. У рамках праграмы будуць паказаныя тры фільмы, знятыя ў перыяд ранняга гукавога кіно. Не адмаўляючыся ад выразных прыёмаў, характэрных для нямога кіно (і ў прыватнасці, нямецкага экспрэсіянізму), гэтыя фільмы ў той жа час працягваюць творчыя пошукі ў галіне кінамовы і зацвярджаюць гук у якасці элемента новай эстэтыкі.**

12 снежня, 19.00

**М: ГОРАД ШУКАЕ ЗАБОЙЦУ | M — Eine Stadt sucht einen Mörder**

Рэжысёр: Фрыц Ланг

Сцэнар: Тэа фон Харбау, Фрыц Ланг па матывах артыкула Эгана Якабсана

Аператар: Фрыц Арна Вагнер

У ролях: Петэр Лоры, Ота Верніке, Густаў Грундгенс, Элен Відман

Германія, 1931, 110 хв.



13 снежня, 19.00

**ТРОХГРАШОВАЯ ОПЕРА | Die Dreigroschenoper**

Рэжысёр: Георг Вільгельм Пабст

Сцэнар: Леа Ланія, Бэла Балаш, Ладыслаўс Вайда па аднайменнай п'есе Бертольда Брэхта

Аператар: Фрыц Арна Вагнер

Музыка: Курт Вайль

У ролях: Рудольф Форстэр, Карола Неер, Валеска Герт, Райнхальд Шунцэль, Фрыц Расп

Германія, 1931, 110 хв.



14 снежня, 19.00

**УПЫР: СОН АЛАНА ГРЭЯ | Vampyr — Der Traum des Allan Grey**

Рэжысёр: Карл Тэадор Дрэер

Сцэнар: Крысцін Джулі, Карл Тэадор Дрэер па матывах кнігі Джозэфа Шэрыдана Ле Фаню «Праз цмянае шкло»

Аператары: Рудольф Матэ, Луі Не

Музыка: Вольфганг Цэлер

У ролях: Джулян Уэст, Морыс Шуц, Рэна Мэндзел, Сібіла Шміц

Германія, 1932, 73 хв.



**Усе фільмы дэманструюцца на мове арыгінала з рускімі субтытрамі.**

**Кінатэатр «Перамога», г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 20; тэлефон для даведак 203 77 66**

Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Мінску. Вул. Захарава, 26
УНН 101166185



Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81. novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1240

Падпісана да друку 09.12.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.